Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЖНІЎНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 157 (27272) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНКА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Нараканні кшталту «ў наш час моладзь была лепшай» — з'ява, якая была, ёсць і будзе. Ці мае рацыю старэйшае пакаленне? Ці сапраўды сёння моладзь «не такая», як была раней?



Далёка не кожны фатограф можа зафіксаваць пэўнае адлюстраванне эмоцый, пачуццяў. Аднак ёсць такія, хто менавіта гэта робіць сваёй мэтай — адлюстраваць на фота жыццё, быццам рэпартаж.



«Умка-клас» — менавіта так называецца прыватны дзіцячы садок, нятанны для бацькоў, але адметны і перадавы, калі казаць пра ўнутранае напаўненне.

СТАР. 4



Айчыннае фехтаванне багатае на імёны знакамітых спартсменаў, якія абавязкова вярталіся з Алімпійскіх гульняў з медалём. А што зараз? Хто задае тон у сучасным фехтаванні?

СТАР. 6



НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +21 |
| Віцебск | +21° |
| Гомель | +21° |
| Гродна | +20° |
| Магілёў | +19° |
| Мінск | +19° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.08.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8360,00 | ▲ |
| Еўра | 10310,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 262,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1032,61 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# На прыём да «цёці Марыны»

**Каля паўтысячы маладых урачоў сёлета выйшла на свае першыя рабочыя месцы ў сталічных паліклініках і бальніцах па размеркаванні. Вось і малады спецыяліст Марына ДАЙНЭКА прымае маленькіх пацыентаў у 15-й мінскай дзіцячай паліклініцы. І ўжо зараз маладога ўрача-педыятра ведаюць і бацькі, і дзеткі, завуць свайго лекара не інакш як наша «цёця Марына».**

**— Сваю прафесію люблю! — усміхаецца Марына Дайнэка. — Ні дня не шкадавала, што стала менавіта ўрачом-педыятрам, бо дзеткі — самыя ўдзячныя пацыенты!**

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**



# З АДЗІНАЙ ПАЗІЦЫІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 15 жніўня на сустрэчы з міністрам замежных спраў Расіі Сяргеем Лаўровым падкрэсліў адзінства пазіцый дзвюх краін па праблемных пытаннях міжнароднага парадку дня.**



Фота БЕЛТА.

«Момант такі, што нам вельмі важна абмеркаваць некаторыя пытанні нашага знешнепалітычнага ўзаемадзеяння на міжнароднай арэне. Ды і нядрэнна было б абмеркаваць некаторыя пытанні беларуска-расійскіх адносін, хоць тут «надзвычайшчыны», напружанасці, на шчасце, ні па адным з пытанняў няма», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатаваў, што гэты год 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Расіяй стаў вельмі плённым ва ўзаемаадносінах. Беларусь з візітамі наведвалі Прэзідэнт Расіі, прэм'ер-міністр, кіраўнікі абедзвюх палат расійскага парламента. Бакі таксама традыцыйна актыўна ўзаемадзейнічаюць па лініі знешнепалітычных ведамстваў. «Паміж МЗС, мы заўсёды аб гэтым гаварылі, у нас узорна-паказальныя адносіны. Дай бог, каб у нас з іншымі ведамствамі былі такія адносіны, як паміж міністэрствамі замежных спраў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

■ Грошы

## У БЕЛАРУСІ РЫХТУЕЦЦА ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ

**На нарадзе ў старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзеі Ермаковай з удзелам кіраўнікоў Міністэрства гандлю, Белкаапсаюза, банкаў-экваераў краіны стала вядома, што Нацбанк рыхтуе праект Дзяржаўнай праграмы развіцця ў Рэспубліцы Беларусь сістэмы безнаяўных разлікаў па рознічных плацяжах з выкарыстаннем сучасных электронных плацежных інструментаў і сродкаў плацяжу на 2012-2015 гады.**

Захады, што ўключаны ў праект, накіраваны на развіццё сістэмы безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак, электронных грошай і іншых плацежных інструментаў, а таксама павышэнне якасці банкаўскага абслугоўвання насельніцтва, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. На 1 ліпеня 2012 года ў Беларусі эмітавана 9,8 млн пластыкавых картак. Колькасць арганізацый гандлю і сэрвісу, дзе ўсталяваны тэрміналы для безнаяўных плацяжоў, — 31232. Але пры гэтым доля безнаяўных, сярод аперацый з банкаўскімі карткамі, складае 61,3% па колькасці аперацый і 18,9% па суме аперацый. Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, доля безнаяўнага грашовага абароту ў рознічным тавараабароце арганізацый рознічнага гандлю складае 12,3%. І хоць усе гэтыя паказчыкі выраслі ў параўнанні з мінулымі, безнаяўныя плацяжы займаюць пакуль далёка не першае месца.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

# З АДЗІНАЙ ПАЗІЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, таксама нядрэнна развіваецца эканамічнае супрацоўніцтва, адзначаецца салідны прырост узаемнага тавараабароту.

«Што датычыцца нашай пазіцыі па міжнародных праблемах і, перш за ўсё, гарачых кропках, то яна цалкам супадае з ацэнкамі і дзейнасцю Расійскай Федэрацыі. Таму ў гэтым плане вы можаце быць абсалютна спакойны і ўпэўнены. Мы падтрымліваем усе вашы памкненні, асабліва па Сірыі па нармалізацыі там сітуацыі», — запэўніў Прэзідэнт Беларусі.

Гаворачы аб сітуацыі ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што напярэдадні маючых адбыцца парламенцкіх выбараў ёсць некаторыя насцярожваючыя фактары. «Вы разумееце, што ідзе актывізацыя палітычнай дзейнасці, і не заўсёды ў патрэбным напрамку. Але пакуль у Беларусі няма ніякіх такіх успляскаў, калі не лічыць Захад, які заўсёды нам падкіне якое-небудзь пытанне», — заявіў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў назначэнне Матэа Мекачы кіраўніком наглядальнікаў ад Парламенцкай асамблеі АБСЕ на будучых парламенцкіх выбарах: «Лічу, што маглі б знайсці больш дасведчанага чалавека ў частцы Беларусі і сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Мы ўважліва цяпер вывучаем усе гэтыя пазіцыі і, вядома ж, будзем адпаведным чынам рэагаваць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Сяргей Лаўроў адзначыў, што на праведзенай сустрэчы з кіраўніком МЗС Беларусі Сяргеем Мартынавым абмяркоўвалася тэма маючых адбыцца ў Беларусі парламенцкіх выбараў і дзейнасці АБСЕ. «У нас ёсць рашэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД аб павышэнні ролі місіі наглядальнікаў ад Садружнасці на прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах. Гэта рашэнне накіравана на тое, каб нашы наглядальнікі аказвалі больш уплыў на гэтыя працэсы на ўсёй еўрапейскай прасторы, і каб не было манаполіі АБСЕ у асобе БДІПЧ, Парламенцкай асамблеі, і каб ацэнкі даваліся на аснове ўзважаных і калектыўных падыходаў і меркаванняў», — сказаў Сяргей Лаўроў.

Ён запэўніў, што Расія забяспечыць удзел сваіх грамадзян у розных наглядальных місіях на выбарах у парламент Беларусі — у складзе Парламенцкай асамблеі АБСЕ, БДІПЧ і ў складзе місіі наглядальнікаў СНД.

Сяргей Лаўроў таксама запэўніў: «Расія будзе рабіць усё, каб ацэнкі парламенцкіх выбараў у Беларусі былі аб'ектыўнымі, непрадузятымі і не былі прадметам нейкіх аднабаковых, кімсьці выдуманых правілаў, якія спрабуюць навязаць у АБСЕ напераккор належным калектыўным шматразовым прапановам выпрацаваць агульнапрымальныя правілы назірання за выбарамі».

«Цяпер расце разуменне ў рамках АБСЕ таго, што трэба ўсё ж такі ў гэтай сферы наводзіць парадак», — сказаў міністр. Ён адзначыў, што ў ліпені Парламенцкая асамблея АБСЕ прыняла рашэнне, якое заклікае правесці параўнальны аналіз выбарчых заканадаўстваў усіх краін — членаў АБСЕ з заклікам на выпрацоўку агульных крытэрыяў.

«Гэта тое, чаго мы дабіваліся. Цяпер нам важна парламенцкае рашэнне перавесці ў міжурадавы фармат, — падкрэсліў кіраўнік МЗС Расіі. — Мы аб гэтым сёння гаварылі з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым. Гэта будзе адна з тэм сумеснага пасяджэння калегій МЗС Беларусі і Расіі, якое адбудзецца ў кастрычніку гэтага года ў Мінску. Мы, безумоўна, абмяркуем на гэтым пасяджэнні ўсе міжнародныя тэмы, уключаючы няпростыя, трывожныя падзеі на поўначы Афрыкі, на Блізкім Усходзе і ў іншых гарачых кропках».

Сяргей Лаўроў таксама адзначыў, што ўжо абмеркаваў з Сяргеем Мартынавым канкрэтныя крокі, неабходныя для выканання дамоўленасцяў, дасягнутых прэзідэнтамі двух краін Аляксандрам Лукашэнкам і Уладзімірам Пуціным, а таксама ў ходзе візіту ў Мінск кіраўніка расійскага ўрада Дзмітрыя Мядзведзева і кіраўнікоў двух палат расійскага парламента.

«Дамоўленасцяў шмат, у тым ліку дамоўленасці аб парламенцкім суправаджэнні працэсаў еўразійскай інтэграцыі. Гэта важна для эфектыўнага заканадаўчага афармлення тых дамоўленасцяў, якія дасягаюць Беларусь, Расія і Казахстан», — сказаў міністр.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ПОСПЕХ МАГЧЫМЫ ПРЫ КАНСАЛІДАЦЫІ НАМАГАННЯЎ УСІХ ГРАМАДЗЯН

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўручыў учора дзяржузнагароды заслужаным людзям краіны, перадае БЕЛТА.**

У спісе ўзнагароджаных 47 чалавек. Гэта кіраўнікі прадпрыемстваў, работнікі прамысловага комплексу, энергетыкі, пракуратуры, падатковых органаў, адукацыі, спорту і культуры. Яны ўдастоены ўзнагарод за шматгадовую стваральную працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў і высокі прафесіяналізм. Медалямі «За працоўныя заслугі» ўзнагароджана вялікая група работнікаў за поспехі ў забеспячэнні законнасці і правапарадку, дасягненне высокіх паказчыкаў у прамысловасці, заслугі ў развіцці гандлю, сістэмы адукацыі, тэатральнага мастацтва. Медалі Францыска Скарыны атрымалі работнікі культуры і мастацтва, у тым ліку прадстаўнікі Нацыянальнага народнага хору Беларусі імя Г.І. Цітовіча, Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Харошкі», Нацыянальнага тэатра імя Я. Коласа.

Звяртаючыся да ўзнагароджаных, прэм'ер-міністр адзначыў сімвалічнасць прысутнасці сярод іх прадстаўнікоў самых розных галін эканомікі, дзяржкіравання і сацыяльнай сферы. «Гэта як у жыцці: поспех магчымы пры кансалідацыі намаганняў усіх грамадзян», — адзначыў ён.

Кіраўнік урада падкрэсліў, што ў 2013 годзе перад краінай стаяць даволі напружаныя задачы: прырост ВУП павінен скласці 8,5 працэнта, экспарту тавараў і паслуг — 15,2 працэнта. Дасягнуць гэтага магчыма толькі аб'яднанымі намаганнямі, выкарыстоўваючы інавацыі, ініцыятыву, прадпрымальніцтва.

Прэм'ер-міністр нагадаў, што дзяржава пайшла на рашучыя крокі па падтрымцы прыватнага сектара, у першую чаргу малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Зніжаны падатковая нагрузка і адміністраванне бізнэсу. Работа ў гэтым напрамку будзе прадоўжана.

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА, ПАЧУЦЬ УСІХ

**Такое меркаванне выказаў учора журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў, які прыняў удзел у пленарным пасяджэнні мінскага гарадскога семінара «Інфармацыйныя рэсурсы сталіцы Рэспублікі Беларусь: сучасны стан і перспектывы развіцця», перадае БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Як адзначыў Аляксандр Радзькоў, кандыдатаў у дэпутаты чакае складаная задача: вытрымаць конкурс у некалькі чалавек на месца (у сярэднім па краіне конкурс складае 4-5 чалавек на адну выбарчую акругу), прычым у гэтай сферы канкурэнцыя асабліва важна. Дапамогуць у гэтым тэлевізійныя, радыйныя выступленні палітыкаў са сваімі передвыбарнымі праграмамі — як плануецца, яны пачнуцца ўжо з 27 жніўня. «Сродкі масавай інфармацыі і інфармацыйныя тэхналогіі адыгрываюць тут важную ролю, — падкрэсліў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Але нягледзячы на багацце электроннай і друкаванай прадукцыі, важна таксама жывое слова. Выбары павінны быць адкрытымі і аб'ектыўнымі, яны павінны дапамагчы знайсці людзей, якім мы даверым заканатворчасць і будучыню Беларусі».

Да пачатку пленарнага пасяджэння семінара Аляксандр Радзькоў разам з іншымі ўдзельнікамі пабываў у кінатэатры «Цэнтральны», дзе паразмаўляў з генеральным дырэктарам УП «Кінавідэапракат» Васілём Коктышам, азнаёміўся з аб'ектамі Галоўпаштамта і работай РУП «Белпошта», пабываў у ААТ «Мінскі аўтамабільны завод».

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ СА СМЕРЦЮ РАСІЙСКАГА ВУЧОНАГА І ТЭЛЕВЯДУЧАГА СЯРГЕЯ КАПІЦЫ

**У сувязі са смерцю расійскага вучонага, тэлевядучага і грамадскага дзеяча прафесара Сяргея Капіцы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні яго родным, блізкім і калегам.**

У спачуванні гаворыцца, што ў Беларусі ведалі і высока цанілі Сяргея Капіцу як выдатнага і нязменнага вядучага навукова-папулярнай тэлеперадачы «Відавочнае — неверагоднае».

«Сяргей Пятровіч пражыў яркае насычанае жыццё, пакінуўшы значны след у гісторыі сусветнай і айчыннай навукі. Адораны вялікім талентам, ён прысвяціў усяго сябе нястомнаму пошуку ісціны, выхаваў цэлую плеяду дастойных маладых вучоных, актыўна працаваў у галіне папулярызацыі навуковых ведаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ІЗРАІЛЬСКІ МІНІСТР АБВЯСЦІЎ КРАІНУ ГАТОВАЙ ДА ВАЙНЫ З ІРАНАМ



Ізраільскі міністр па справах грамадзянскай абароны Матан Вільнаі заявіў, што магчымая вайна супраць Ірана будзе доўжыцца не больш за месяц, а яе ахвярамі могуць стаць да 500 чалавек, паведамляе Reuters. Паводле яго слоў, гэта не павінна быць падставай для істэрыкі, паколькі грамадзянская абарона Ізраіля гатова да такога развіцця падзей «лепш, чым калі-небудзь». Пры гэтым сам Вільнаі адмовіўся адказваць на пытанне аб неабходнасці ўдару па іранскіх ядзерных аб'ектах.

### БЕЛАРУСЬ У РЭЙТЫНГУ СТАНУ ЗДАРОЎЯ ЖЫХАРОЎ АБЫШЛА РАСІЮ І УКРАІНУ

91-е месца заняла Беларусь са 145 магчымых у рэйтынгу стану здароўя жыхароў розных дзяржаў, які быў складзены агенцтвам Bloomberg. Паводле разлікаў агенцтва, самыя здаровыя грамадзяне жывуць у Сінгапуры. Другое месца ў Італіі, а замыкае тройку Аўстралія. Далей топ-10 здаровых краін выглядае наступным чынам: Швейцарыя, Японія, Ізраіль, Іспанія, Нідэрланды, Швецыя і Германія. А ў самай ніжняй частцы рэйтынгу здаровых краін знаходзяцца Мазамбік, Чад, Конга, Лесота, а таксама Свазіленд.

Што ж тычыцца былых рэспублік Савецкага Саюза, то тут справы ідуць наступным чынам. Самая здаровая з былога складу СССР — Грузія, якая знаходзіцца ў рэйтынгу ад Bloomberg на 71-м месцы. На 79-й пазіцыі Латвія і Арменія. 81-е месца ў Літвы, 84-ы Таджыкістан, на радок ніжэй Узбекістан, на 87-м месцы Азербайджан. Беларусь размясцілася на 91-м месцы, а Расія на 97-й пазіцыі. 99-е месца за Украінай.

Рэйтынг ад Bloomberg заснаваны на шэрагу паказчыкаў, сярод якіх працягласць жыцця грамадзян, узровень дзіцячай смяротнасці, прычыны, якія выклікаюць смяротнасць, а таксама паказчыкі смяротнасці для розных узроставых груп. Акрамя таго, пад увагу прымалася колькасць курцоў у дзяржаве, узровень ужывання спіртных напояў, фізічная актыўнасць насельніцтва, колькасць ВІЧ-інфіцыраваных, экалагічная сітуацыя ў краіне і шэраг іншых крытэрыяў.

### ГРЭЦЫЯ ДАМАГАЕЦЦА ПАДАЎЖЭННЯ СТАБІЛІЗАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ ДАПАМОГІ НА ДВА ГАДЫ

Грэцыя спрабуе дамагчыся падаўжэння на два гады тэрміну дзеяння праграмы бюджэтнай эканоміі, каб стабілізаваць сітуацыю з дзярждоўгам і аднавіць рост нацыянальнай эканомікі, перадаюць інфармагенцтвы са спасылкай на газету Financial Times. Як чакаецца, прэм'ер-міністр краіны Антоніс Самарас прадставіць гэтую прапанову канцлеру Германіі Ангеле Меркель і прэзідэнту Францыі Франсуа Аланду падчас іх маючай адбыцца на будучым тыдні трохбаковай сустрэчы ў Парыжы.

03 сентября 2012 г. в 19.00 по адресу: г. Минск, ул. Козлова, д. 35, «Столичный буфет» состоится внеочередное Общее собрание акционеров ЗАО «Возвышенность».

Повестка дня:

1. О реорганизации Закрытого акционерного общества «Возвышенность» путем присоединения к Обществу с ограниченной ответственностью «Новита».

2. О выкупе Закрытым акционерным обществом «Возвышенность» акций Общества по требованию акционеров.

С документами, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1 с 09.00 до 18.00 ежедневно, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая, карточками, изготовленными из бумаги с указанием количества голосов.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании участников Общества, будет проводиться с 18 часов 30 минут до 18 часов 55 минут в день и по месту проведения собрания. При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

*ЗАО «Возвышенность», г. Минск, пр-т Независимости, 16, ком. 1.*

*УНП 100088694*

**ОАО «Барановичский молочный комбинат», расположенное по адресу: г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 51, уведомляет акционеров о том, что 03 августа 2012 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров Общества.**

**Повестка дня собрания:**

1. О внесении и утверждении изменений и дополнений в устав Общества.

2. О прекращении полномочий членов наблюдательного Совета и избрании новых членов наблюдательного Совета Общества.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 27.08.2012 года с 8.00 часов до 17 часов (перерыв с 12.00 до 13.00) по месту нахождения Общества, а в день проведения собрания — в помещении его проведения.

Регистрация участников собрания состоится в день и по месту его проведения с 13.00 до 14.00 по предъявлению документа, удостоверяющего личность акционера, доверенности, зарегистрированной в установленном порядке, — для представителя акционера (акционеров), а также документа, подтверждающего полномочия, — для руководителей юридических лиц — акционеров Общества.

*УНП 200167548*

■ Радар

# З КЛОПАТАМ ПРА ЮНЫХ ПАСАЖЫРАЎ

**Дзяржаўтаінспекцыя правяла ў сталіцы прафілактычную акцыю «Дзіця — галоўны пасажыр!» Супрацоўнікі ДАІ спынялі аўтамабілі, у якіх знаходзіліся дзеці. У выпадку парушэнняў бацькам нагадвалі правілы бяспечнай перавозкі непаўналетніх пасажыраў.**



— Падчас акцыі мы спынілі 72 машыны, — расказвае старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Беларусі Ганна Банадык. — І толькі ў 12 з іх уладальнікі выконвалі ўсе правілы перавозкі дзяцей. Для гэтых клапатлівых бацькоў мы падрыхтавалі невялікія сувеніры і запрасілі да гэтага, каб разыграць падарункі — дзіцячае аўтакрэсла і бустар (сядзенне для дзяцей ад 7 да 12 гадоў).

Паводле звестак ДАІ, у першай палове гэтага года на дарогах краіны ў ДТЗ загінулі 5 і пацярпелі 75 дзяцей з-за таго, што кіроўцы не паклапаціліся аб іх бяспецы ў салоне аўтамабіля. Гэта абумоўлена тым, што падчас канікулаў шмат дзяцей едуць з месцаў адпачынку і аздараўлення.

Невыкананне пры гэтым элементарных мер бяспекі прыводзіць да гібелі і траўміравання дзяцей. Пазбегнуць такіх наступстваў дапамогуць, напрыклад, дзіцячыя ўтрымлівальныя прылады, рамяні бяспекі. Таксама трэба памятаць, што перавозіць дзяцей да 12 гадоў можна толькі на заднім сядзенні.

**Настасся ХРАЛОВІЧ, фота аўтара** ■

■ Ну і ну!

# БРАЛІ НАПРАКАТ АЎТАМАБІЛІ І... ПРАДАВАЛІ ІХ

**Менавіта такі своеасаблівы бізнэс наладзіла ў нашай сталіцы злачынная група з Расіі. Два беспрацоўныя 32-гадовыя жыхары аднаго з расійскіх рэгіёнаў паспелі «пракруціць» сваю немудрагелістую схему, пакуль іх не затрымалі.**

Як расказалі ў Партызанскім РУУС г. Мінска, усё пачалося ў красавіку. Тады ў адзін з пракатных салонаў звярнуўся малады чалавек, які пажадаў узяць на некалькі дзён аўтамабіль «Таёта Кемры». Заплаціўшы за паслугі і пакінуўшы пашпартныя даныя (як потым высветлілася — несапраўдныя), кліент атрымаў машыну. Потым разам з «паплечнікам па бізнэсе» даў у інтэрнэце аб'яву аб продажы аўтамабіля па цане, ніжэйшай за рынкавую. Тым часам зламыснікі ўкралі з прыпаркаванай у адным з двароў машыны транзітныя нумары і прымацавалі іх да «Таёты». Пасля чаго яны паставілі ў тэхпашпарце падробную пячатку ДАІ аб зняцці машыны з уліку і ўпісалі туды нумар украдзенага рэгістрацыйнага нумара. Потым прадалі іншамарку за 20 тысяч долараў і з'ехалі з краіны.

Паколькі ўсё прайшло ўдала, праз месяц дуэт такім жа чынам паспяхова «пракруціў» яшчэ адну аперацыю з «Таётай Кемры», але праз салон пракату ў іншым раёне сталіцы. Калі расіяне прыехалі ў Мінск у трэці раз і зноў узялі напракат аўтамабіль той жа маркі, іх затрымалі. Расіяне не сталі адмаўляць сваёй датычнасці да здзяйснення махлярства і падрабязна распавялі пра схему сваіх дзеянняў. Зараз праваярацца магчымае дачыненне падазроных да іншых аўтамабільных махлярстваў, у тым ліку і ў іншых рэгіёнах краіны. Што датычыцца пракатных салонаў, дык яны ўжо вярнулі назад свае іншамаркі. А вось іх пакупнікі, якія спакусіліся на прапановы зламыснікаў купіць танна аўтамабілі, страцілі немалыя сумы грошай, бо ў гэтым выпадку пытанне пакрыцця ўрону — дастаткова праблематычнае...

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■


**Извещение о проведении 17 сентября 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Гроднооптторг»**

| № лота | Предмет торгов (наименование и начальная цена предмета торгов с учетом НДС) | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|
| 1. | Торговый киоск. Начальная цена лота – 27 600 000 бел. рублей. | 2 760 000 |
| 2. | Автомобиль «Renault Espace». Начальная цена лота – 10 465 800 бел. рублей. | 1 046 580 |

| | |
|---|---|
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Гродно, станция Лососно |
| Сведения о продавце | ОАО «Гроднооптторг», 230001, г. Гродно, ст. Лососно, телефоны (0152)55-39-12, (044)566-00-54, (044) 566-00-45 |
| Сведения об организаторе аукциона | Управляющий по делу о банкротстве ОАО «Гроднооптторг» ЧП «Корпорация Антикризисного Управления», телефоны (0152)55-39-12, (044)566-00-54, (044) 566-00-45 |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок по 13.09.2012 включительно на расчетный счет № 3012127410010 в Региональной Дирекции № 400 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Гродно, код 153001369, получатель – ОАО «Гроднооптторг», УНП 500013881.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному частнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи.

Аукцион состоится 17 сентября 2012 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ст. Лососно, актовый зал. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 16.08.2012 по 13.09.2012 включительно в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ст. Лососно (административное здание).

Ознакомление с предметом торгов осуществляется по предварительному согласованию с продавцом.

Телефоны для справок: (0152)52-46-01, (0152)55-39-12, (044)566-00-54, (044) 566-00-45.

**Сайты в интернете:www.kay.by, www.opttorg.grodno.by**


НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## СВЯТКУЕМ ЯБЛЫЧНЫ СПАС!

У вёсцы Перабродддзе Мёрскага раёна адбудзецца свята «Перабродская зорка» (19 жніўня), на якое запрасілі і гасцей з-за мяжы.

У праграме — конкурс дзіцячых малюнкаў, выстава народных майстроў з Мёрскага і Браслаўскага раёнаў, выстава дароў прыроды.

Асвецяць садавіну, як гэта рабілі нашы продкі, на Яблычны Спас. Адбудзецца і святочны канцэрт. Выступяць калектывы мастацкай самадзейнасці Перабродскага і Паташнянскага сельскіх клубаў. Сярод ганаровых гасцей-удзельнікаў — віцебскі вакальны ансамбль «Юр'еў дзень» і замежны калектыў «Уздым» — з латвійскага горада Даўгаўпілс.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ІНШАЗЕМЕЦ? ЗАРЭГІСТРУЙСЯ

Падчас правядзення спецаперацыі «Нелегал» супрацоўнікі Першамайскага РУУС г.Мінска прыцягнулі да крымінальнай адказнасці дзевяць асоб, якія парушылі правілы знаходжання ў нашай краіне, а таксама двух грамадзян Беларусі, што прадастаўлялі жылыя памяшканні незарэгістраваным іншаземцам.

— Напрыклад, падчас праверкі аднаго са студэнцкіх інтэрнатаў супрацоўнікі аддзела па грамадзянстве і міграцыі РУУС выявілі студэнта з Сярэдняй Азіі, які працяглы час пражываў не па месцы рэгістрацыі. Малады чалавек прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, адпаведны сігнал накіраваны па месцы яго вучобы, — расказалі ў Першамайскім РУУС г.Мінска.

Варта нагадаць, што замежным грамадзянам неабходна цягам пяці сутак (за выключэннем выхадных і святочных дзён) зарэгістравацца па месцы свайго фактычнага часовага знаходжання. Гэтае правіла не распаўсюджваецца на грамадзян Расійскай Федэрацыі, Украіны, Літвы і Латвіі. Грамадзяне названых краін, у адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі, павінны зарэгістравацца на працягу 30 сутак з моманту ўезду ў нашу краіну.

## ПЕНСІЯНЕРКА ПАВІСЛА З БАЛКОНА ЎНІЗ ГАЛАВОЙ

У Жлобіне работнікі МНС выратавалі пенсіянерку, якая спрабавала выскачыць з балкона шостага паверха.

— Пасля 15 гадзін паступіла паведамленне, што ў мікрараёне № 17 з балкона шостага паверха ўніз галавой вісіць пажылая жанчына, — расказаў «Звяздзе» старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Пазней высветлілася, што пры спробе скінуцца з акна балкона нага пенсіянеркі патрапіла ў зазор паміж адчыненай аконнай рамай і падаконнікам. Адбыўся пералом косці галёнкі левай нагі і пацярпелая завісла галавой уніз звонку балкона. Выратавальнікі разам з міліцыянерамі ўзламалі дзверы ў кватэру і ўцягнулі жанчыну ўнутр. Адначасова да балкона была ўстаноўлена лесвіца.

72-гадовая пацярпелая была перададзена брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі і дастаўлена ў прыёмны пакой Жлобінскай цэнтральнай раённай бальніцы. Высветлілася, што жанчына з'яўляецца інвалідам першай групы па псіхічным захворванні і раней ужо здзяйсняла спробу суіцыду.

## ЗАГІНУЛА ЎСЯ СЯМ'Я...

Жудасная трагедыя адбылася на аўтадарозе Нясвіж — Цімкавічы паблізу вёскі Пляшэвічы Нясвіжскага раёна.

Тут удзень адбылося лабавое сутыкненне легкавога аўтамабіля "Фольксваген Пасат В-3" і грузавіка «МАЗ». У выніку дарожна-транспартнага здарэння ў легкавіку загінулі тры чалавекі: кіроўца 1987 года нараджэння і яго сям'я — жонка-аднагодка і трохгадовае дзіця. Кіроўца «МАЗа» не пацярпеў.

## КІРОЎЦА Ў ЦЯЖКІМ СТАНЕ, ПАСАЖЫР — ЗАГІНУЎ




Чарговае дарожна-транспартнае здарэнне са смяротным зыходам адбылося ноччу ў сталіцы.

Каля 4.45 з гульнявога клуба выйшлі жанчына з мужчынам, селі ў «Нісан-Сані». За рулём была 45-гадовая кіроўца. Аўтамашына пачала рухацца па вуліцы Кунцаўшчына — з боку вуліцы Прытыцкага ў напрамку вуліцы Матусевіча. Аднак праехаць жанчына здолела няшмат: літаральна праз 500 метраў не справілася з кіраваннем і сутыкнулася з прыпаркаванымі па ходу руху аўтамабілямі «Опель Зафіра» і «Фіят Тэмпра». Паводле інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, у выніку дарожна-транспартнага здарэння 37-гадовы пасажыр «Нісана» ад атрыманых траўмаў памёр на месцы здарэння. На момант аварыі ён знаходзіўся на пярэднім сядзенні, і выратавальнікам, каб дастаць з салона цела, давялося выкарыстоўваць гідраўлічны інструмент. Жанчыну-кіроўцу даставілі работнікі ДАІ. З дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма, тупая траўма жывата» брыгада медыкаў даставіла пацярпелую ў гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі. Стан жанчыны цяжкі, але яна была ў прытомнасці. Па словах работнікаў ДАІ, кіроўца была нападпітку.

## ПЕРАБЛЫТАЎ ДЗВЕРЫ...

У падвал фірменнай крамы № 4 ААТ «Камунарка», якая ўбудавана ў жылы дом па сталічнай вуліцы Камуністычная, упаў чалавек.

Як высветлілася, здарэнне адбылося па асабістай неасцярожнасці грамадзяніна 1967 года нараджэння (месца яго рэгістрацыі ўстанаўліваецца): той пераблытаў уваход у пад'езд з дзвярыма шахты грузавога ліфта, якая вяла ў падвал. Магчыма, гэтаму паспрыяла тое, што чалавек быў нападпітку? Даставаць яго з падвала праз шахту ліфта работнікам МНС давялося пры дапамозе выратавальнага абсталявання. Пасля небараку перадалі медыкам, аднак тыя, агледзеўшы грамадзяніна, адпусцілі яго дадому.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Логойского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Расходы по подготовке документов | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Цна, участок № 8 623287609601000028 | 0,2211 | 2 812 635 | 13 266 000 | 2 653 200 |
| 2 | д. Кроква, участок № 4 623287603101000064 | 0,2101 | 2 875 572 | 8 404 000 | 1 680 800 |
| 3 | д. Погребище, участок № 8 623287607101000068 | 0,2009 | 2 875 572 | 8 036 000 | 1 607 200 |

Задаток перечисляется на р/с 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска, УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится 17 сентября 2012 года в 14.00 по адресу: Минская обл., Логойский р-н, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 14.00 12 сентября 2012 года.

Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, 8(029) 107 16 17.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.

# ЛІСТЫ ДА ЖЫЛІБЕРА

## Вакол медыцыны са Святланай Дзянісавай



**Іх можна палічыць за авантуру чыстай вады. Хаця б таму, што няшмат знойдзецца ў свеце людзей, якім захочацца напісаць у мінулае. І ўсё ж, спадзяюся, іх палічаць за патрэбныя. Бо якая там будучыня — без папяраднікаў?! І калі нешта тут будзе сказана з уколам, то гэта той укол, што даецца на здароўе.**

### Monsieur Jean!

На вялікі жаль, я не ведаю французскай мовы і таму пішу Вам на той, якую Вы, меўшы некалі магчымасць чуць штодзённа, спадзяюся, не толькі разумееце, але і паважаеце. Зрэшты, да радасці маёй, нас аб'ядноўвае лаціна. А таксама павага да той навукі і справы, чыя назва ў Ваш і мой час гучыць аднолькава прыгожа і годна — medicina (я не кажу ўжо пра любоў да Гародні, у якой Вы правялі некалькі далёка не бясплодных гадоў, а я, прабачце, усяго толькі нарадзілася). Калі, monsieur, дазволіце мне, то я, цалкам пакладаючыся на Вашу прыхільнасць, буду даводзіць Вам пісьмова некаторыя свае думкі. Ex necessitate, так бы мовіць, — па неабходнасці.

Каб Вы толькі ведалі, monsieur, як шкада мне, што студэнтам сучасных медыцынскіх універсітэтаў не выкладаецца майстэрства каліграфіі! Мовы — родная, замежныя і лаціна — выкладаюцца, а іх «папярова-чарнільная версія» — не. Шкада мне гэтага не толькі таму, што я нeяк бачыла, як зграбна, элегантна, вытанчана Вы, прафесар медыцыны, падпісалі ўзоры гербарыя, сабранага ў ваколіцах Гародні і Нясвіжа. Паглядзелі б Вы, аўтар разгромнай «Анархіі медыцыны», якім почыркам робіца anamnesis morbi, запіс гісторыі хваробы ўчастковымі тэрапеўтамі, хірургамі, гінеколагамі і стаматолагамі ў амбулаторныя карткі пацыентаў XXI стагоддзя. Ad absurdum!

Кажуць, што будучых медыкаў спецыяльна вучаць пісаць неразборліва. Па версіі адных, гэта робіцца для таго, каб занадта цікаўны хворы не змог, як бы ні імкнуўся, даведацца пра сваю хваробу больш, чым скажа яму пра яе ўрач: бо прачытаць нешта больш дасціпнае, чым тое, што напісана ў медыцынскай энцыклапедыі, можна толькі з-пад пяра таго, хто на свае вочы бачыў тваё міндаліны і ведае не толькі састаў тваёй крыві, але і расклад яе руху.

Некаторым здаецца, што неразборлівасць урачэбных запісаў — гэта нешта накшталт інтрыгі супраць будучых судовых разбіральніцтваў, калі яны раптам здарацца па віне пацыента, які, не жадаючы паміраць, пачне рабіць падкоп пад крэсла ля стала, на якім ляжыць, не адрозніваючы levorinum ад lanolinum ці leonurum, лісток назначэнняў. Наколькі гэта паспяховая справа, мяркуйце, калі ласка, самі — па тым, што выпадкі, калі радок з дыягназам не змаглі прачытаць ні суддзя, ні пракурор, ні нават падсудны, у нашым стагоддзі ёсць status naturalis — здараюцца. На жаль гэта ці на шчасце? Suum, як кажуць, cuique: кожнаму сваё. Вопыт апошняга часу падказаў нядрэнны спосаб зарабляць грошы: пацыент падае ў суд на ўрача, запіс якога немагчыма «расшыфраваць», — і атрымлівае «маральную кампенсацыю». Што ні робіцца, усё да лепшага? Звернемся, калі дазволіце, да статыстыкі. Вось інфармацыя даследчыкаў Бернскага ўніверсітэта: з дзвюх соцень разгледжаных выпадкаў exitus letalis дваццаць пяць адсоткаў адбылося... не, не з-за няправільна прызначанага лячэння: прычынай смерці стала ўсяго толькі тое, што правільна прызначанае лячэнне было няправільна прачытана аптэкарам!

Я не ведаю, ці крыўдна паміраць з-за памылкі чалавека. Але я ведаю, здагадваюся, што гэта вельмі крыўдна: не жыць, калі ад цябе яшчэ шмат што чакае чалавецтва.

За гэтым развітацца. Застаюся шчыра адданай Вашай светласці, спадзяюся на Вашу добразычлівасць, з пакорай дзякую за ўвагу.

■ Свая справа

# ПРЫВАТНАЕ ВЫХАВАННЕ

**У Магілёве запрацаваў прыватны дзіцячы садок, дзе дашкольнікаў выхоўваюць і вучаць з выкарыстаннем педагагічнай сістэмы Марыі Мантэсоры.**

### Дзяцінства па Мантэсоры

Алена Марцінкова — магіляўчанка, маладая і прыгожая жанчына, заснавальніца свайго прадпрыемства. «Умка-клас» — менавіта так называецца прыватны дзіцячы садок, нятанны для бацькоў (калі адразу пра грошы), але адметны і перадавы, калі казаць пра ўнутранае напаўненне.

Таму што нічога адметнага знешне тут няма. Звычайны дзіцячы садок на вуліцы Фаціна, у аддаленым ад цэнтра Магілёва мікраёне. Частка яго перададзена прыватнаму прадпрыемству. Унутры групы — нармальны «садаўскі» інтэр'ер, светлая мэбля, яркія цацкі. Светла, чыста і пахне дзяцінствам.

...Пачынаецца ўрок замежнай мовы, з музыкай і англійскімі песенькамі. Па заканчэнні дзеці атрымліваюць «зорачкі» заахвочвання і апантана клеяць іх на свае шафы. Малыя раскаваныя, без лішняй сарамлівасці знаёмяцца і вольна размаўляюць.

— Дзеці ў нас больш адкрытыя для стасункаў, — пацвярджае ўражанне Алена Марцінкова. — Дзякуючы выкарыстанню методыкі Марыі Мантэсоры яны атрымліваюць найперш камунікатыўныя навыкі. Увогуле ў нас тут да ўсяго навуковы падыход. Мы робім націск на асобу, самастойнасць, свабоду выбару.

Педагогіка Марыі Мантэсоры — зусім не нешта ўльтрасучаснае і моднае, але запатрабаванае ўжо больш за сотню гадоў. Італьянка сваю першую школу адкрыла ў 1907 годзе і стала адным з чатырох педагогаў у свеце, якія, паводле ЮНЕСКА, вызначылі спосаб педагагічнага мыслення ў XX стагоддзі. Адзін з іх, дарэчы, вядомы савецкі педагог Антон Макаранка.

Сістэма Мантэсоры заснавана на індывідуальным падыходзе да кожнага дзіцяці. Малыя, была перакананa педагог і філосаф, павінны вучыцца вольна, у сваім рытме, без прымусу, знешняга ўмяшання і крытыкі.

### Жыццёвая педагогіка

Увогуле ў Магілёве нікога не здзівіць педагагічнай адукацыяй: універсітэт імя Куляшова рыхтуе цэлую армію спецыялістаў у справе выхавання і адукацыі. Але зусім не сакрэт, што маладыя жыхаркі Магілёўшчыны нярэдка ідуць у педагагічную ВНУ не столькі з жаданнем (і тым больш адчуваючы жыццёвае прызначэнне) працаваць з дзецьмі, а каб атрымаць вышэйшую адукацыю і толькі ўжо потым вырашыць, дзе і кім працаваць.

З Аленай Марцінковай усё здарылася па-іншаму. Дакладна, наадварот. Яна хацела стаць педагогам, але сваякі — натуральна, з лепшых пабуджэнняў — адгаварылі дзяўчыну ад паступлення ў такую навучальную ўстанову. Тады, у 1990-я, былі не самыя стабільныя часіны і складанае жыццё, таму эканамічная, бухгалтарская спецыяльнасць падавалася лепшым выбарам, а прадпрымальніцкая дзейнасць у сферы гандлю — добрай магчымасцю зарабляць «на хлеб з маслам».

— Гэта не перашкодзіла мне потым атрымаць другую вышэйшую адукацыю, але ўсё ж першая мне дапамагае і цяпер, калі я займела сваё прыватнае прадпрыемства, — гаворыць жанчына.

Знаёмства з педагагічнай сістэмай Марыі Мантэсоры — проста збег абставін, прызнаецца Марцінкова. Убачыла яна такія дзіцячыя групы ў Маскве, дзе пэўны час давялося жыць і працаваць.

— Мяне ўразіла атмасфера: яна была зусім іншая, — прызнаецца Алена, якая выхоўвае 6-гадовую дачку Анастасію. — І размаўлялі там з дзецьмі па-іншаму. У мяне было адчуванне, што я трапіла дадому, а не ва ўстанову.

З тых часоў і з'явілася ідэя адкрыць сваю дзіцячую групу па Мантэсоры, але для гэтага давялося спачатку падмацаваць яе ведамі. Муж падтрымаў кіпучую дзейнасць Алены. Яна прайшла вялікі шлях да адкрыцця сваёй справы і дзякуе за садзейнічанне абласному ўпраўленню адукацыі.



### Нятаннае задавальненне

У 2007 годзе ў Магілёве Алена адкрыла дзіцячы клуб «Умка» для дзяцей да 3 гадоў, якія паспяхова дзейнічае і цяпер. Толькі цяпер яго выхаванцы могуць ісці далей у дзіцячы садок.

У клуб прыходзяць дзеці са сваімі маці: заняткі два разы на тыдзень па паўтары гадзіны каштуюць цяпер 280 тысяч рублёў у месяц. Маці, прызнаецца Алена, вучацца не менш за сваіх малых — найперш як правільна кантактаваць са сваімі дзецьмі. Ніякай пугі (у пераносным сэнсе, вядома) і перніка, а спрабаваць нармальна размаўляць. Фарміраваць асобу, развіваць яе, а не падпарадкоўваць. Нездарма клуб «Умка» вельмі папулярны: у ім цяпер прыкладна сотня ўдзельнікаў.

У дзіцячым садку сёння 13 дзяцей рознага ўзросту. Рознаўзроставыя групы педагогі вітаюць: па-першае, малыя вучацца ў старэйшых, а па-другое, старэйшыя вучацца даглядаць малодшых, клапаціцца аб іх і адчуваць адказнасць.

Займаюцца з дзецьмі маладыя жанчыны. Усе яны маюць педагагічную адукацыю, але да паступлення на працу ў садок «Умка-клас» не мелі вопыту і пачалі сваю дзейнасць з нуля. Акрамя звычайных заняткаў для развіцця дзяцей, у сад прыходзяць тры спецыялісты — па музыцы, харэаграфіі і замежнай мове.

Нягледзячы на значную плату (а яна ў разы перавышае звычайную), усё ж такі прыватнае прадпрыемства Марцінковай пакуль не дацягнула да значных прыбыткаў і «сытага» існавання.

— Так, не буду ўтойваць, што сёння да нас прыходзяць дзеці заможных бацькоў, нават нягледзячы на тое, што знаходзіцца садок не ў цэнтры, — расказвае Алена. — Штомесяц трэба плаціць 1,3 мільёна рублёў, а з верасня плата ўзрасце да 1,6 мільёна. У халодны сезон трэць выручкі даводзіцца выдаткоўваць толькі на камунальныя плацяжы. На прыбыткі мы, у асноўным, набываем матэрыялы для развіцця дзяцей, каб стварыць базу навучання, а гэта, паверце, каштуе вельмі істотна. Таму, скажам шчыра, нашы ўласныя заробкі яшчэ не дасягнулі жаданых 500 долараў.

### Самастойнае меркаванне

Марцінкова лічыць, што няхай не ўдаецца, ва ўсякім разе пакуль, зарабіць шмат грошай, але яна атрымлівае задавальненне маральнае, калі бачыць вынікі сваёй працы ў дзецях.

Як чалавек па-сапраўднаму захоплены сваёй справай Алена можа бясконца распавядаць пра нюансы навучання па Мантэсоры. Іх вельмі шмат. Напрыклад, развіццё самастойных навыкаў. У, так бы мовіць, звычайных варунках маці апранаюць сваіх маленькіх дзяцей (не хапае часу, трэба бегчы, так хутчэй), а потым у нейкі момант вырашаюць, што нашчадак вырас і можа рабіць гэта самастойна: «Давай сам! Ты ўжо вялікі!» А ён не хоча і супраціўляецца.

— У нас ніхто за дзіця нічога рабіць не будзе: няхай гэта будзе марудна, але трэба паказаць, як гэта рабіць, і далей усё робіцца самастойна, — тлумачыць Алена. — Прапануем дапамогу, але, калі дзіця захоча рабіць само — гэта будзе яго выбар. Калі не захоча зусім — будзем імкнуцца дамовіцца, вельмі спакойна. Толькі мірам, без загадаў альбо крыку. Мы выказваем павагу да дзяцей.

«Ніякіх адмоўных эмоцый» — гэта яшчэ адзін дэвіз выхавання дзяцей.

— Мы не ўказваем дзецям на памылкі, — пацвярджае Алена. — Яны павінны вырасці з адчуваннем поспеху, што ў іх абавязкова ўсё атрымліваецца. З гэтым і пайсці ў дарослае жыццё. І яшчэ ў нашых дзяцей заўсёды на ўсё ёсць уласнае меркаванне — мы гэта падтрымліваем і цэнім.

### Дзіцячыя месцы

Якая перспектыва прыватнага садка «Умка-клас»? Алена Марцінкова хоча пашырацца. Дзіцячы садок ужо мае спіс чакання: бацькі хочуць аддаць сваіх дзяцей менавіта сюды, але магчымасці прыняць іх пакуль няма.

— Так, я мару яшчэ і пра пачатковую школу, — прызнаецца жанчына. — Але тут патрэбна падтрымка мясцовых улад, без гэтага не абысціся.

Між тым, на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Леанід Сматрыцкі адзначыў, што, нягледзячы на агульную забяспечанасць месцамі ў дзіцячых садках па вобласці ў 109%, усё-такі існуюць праблемы з гэтым, асабліва ў Магілёве і Бабруйску.

Тлумачэнне такое: большасць дзіцячых садкоў, якія будаваліся раней, апынулася сёння ў мікрараёнах, дзе жывуць людзі, дзеці якіх выраслі. А вось там, дзе шмат новабудоўляў, месцаў у дашкольных установах якраз не хапае.

Акрамя будаўніцтва новых дзіцячых садкоў, улады разглядаюць магчымасць падвозу ў дзіцячыя сады ў абласным цэнтры і Бабруйску. Але ўсё ж больш дапамагчы з дэфіцытам месцаў маглі б, паводле меркавання спецыялістаў абласнога ўпраўлення адукацыі, адкрыццё і развіццё прыватных дзіцячых садкоў.

**Ілона ІВАНОВА.** Фота аўтара

### Парады бацькам ад Алены Марцінковай:

*1. Прымаць сваё дзіця безумоўна — гэта самае важнае. Мы яго любім не за тое, што яно добрае, прыгожае і разумнае, а за тое, што гэта наша дзіця. Трэба яго прымаць такім, якое яно ёсць. Апошнія словы цалкам можна адрасаваць не толькі бацькам, але і педагогам, якія працуюць з дзецьмі.*

*2. Дапамагчы дзіцяці стаць самастойным — вось гэта сапраўдная задача для бацькоў. Не проста прымусіць яго, не проста ім камандаваць, але трэба навучыць яго рабіць разам, а потым даваць магчымасць самастойна прымаць рашэнні.*

*3. Жыць інтарэсамі свайго дзіцяці. Гэта не значыць забыцца на ўсе ўласныя інтарэсы. Але трэба шукаць кропкі судакранання і дапамагчы яму развівацца — маляваць альбо катацца на кані, што захоча.*

*4. І асобнае пажаданне бацькам дзяцей да 3 гадоў: калі ласка, не садзіце сваіх малых перад тэлевізарам. Усё зразумела: шмат клопатаў, трэба заняць дзіця хоць нечым, і тэлевізар падаецца добрым выйсцем. Але дрэнных наступстваў ад гэтага больш: праблемы з камунікацыяй і гутаркай, нават затрымка развіцця. Акрамя гэтага, тут закладаюцца мадэлі паводзін. Мультфільм «Маша і мядзведзь» — для дарослых. Цікава глядзець, як паводзіць сябе Маша, смяецца з гэтага. Але калі гэтак жа будзе паводзіць сябе ваша дзіця — гэта ўжо будзе зусім іншае «кіно»...*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 ЖНІЎНЯ 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15701)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Каштоўны кадр*

# АНТОН МАТОЛЬКА: ЖЫЦЦЁ Ў РУХУ

**Каб зафіксаваць пэўнае адлюстраванне эмоцый, пачуццяў, патрэбен талент. Далёка не кожны фатограф спраўляецца з такой задачай. Аднак ёсць і такія, хто менавіта гэта робіць сваёй мэтай — адлюстраваць на фотаздымку жыццё, быццам рэпартаж. Малады фатограф Антон Матолька, як герой-супермен, трапляе з фотаапаратам у самую гушчыню падзей...**


Антон усюдыісны...



Вяселле павінна быць арыгінальным.Ці як мінімум — вясёлым!

**— Што, на тваю думку, самае складанае для фатографа-пачаткоўца?**

— Самае цяжкае — гэта... выдаляць уласныя фотаздымкі. Напрыклад, раней з фотасэту ў 100 кадраў у мяне заставаліся ўсе 100 кадраў. А зараз, груба кажучы, з 400 фотаздымкаў адбіраю толькі 4-5 больш-менш якасных, яшчэ штук 50 пакідаю па нейкай прычыне (а можа, спатрэбіцца). Аднак гэта не значыць, што паўсотні фотаздымкаў прыгодныя для выкарыстання. Сяргей Максімышын, вядомы расійскі фатограф, аднойчы сказаў: «Усе мы здымаем адно і тое ж, толькі ў таленавітага фатографа 99% няякасных і 1% якасных фотаздымкаў, а ў дрэннага фатографа ўсе 100% няякасных». Я лічу, што трэба проста цвяроза падыходзіць да гэтага занятку, глядзець вакол, не баяцца як чужой, так і ўласнай крытыкі і цэнзуры.

**— Ты паспяваеш аператыўна адлюстроўваць самы «пік» падзей. Як у цябе гэта атрымоўваецца? Дапамагаюць сувязі?**

— Сувязі ў мяне даўно — напрыклад, з нашым небам. Як толькі пачынае збірацца дождж, неба мне адразу тэлефануе, і я выязджаю на затапленне (*смяецца*). На самой справе, інтэрнэт — гэта вялікая, карысная, а пры правільным падыходзе, яшчэ і неабходная рэч. Сацыяльныя сеткі, напрыклад, даюць інфармацыю, якую ты не ведаеш. Тут могуць напісаць сябры ці знаёмыя пра падзею ці мерапрыемства, цікавае для цябе. Даволі проста даведацца пра тыя ж затапленні. Напрыклад, калі ты ведаеш, што прагназуюцца вялікія ліўні, то проста адкрываеш радары і глядзіш, наколькі магутнымі яны будуць і дзе чакаецца наймацнейшы. Ну, і, натуральна, не апошнюю ролю адыгрывае шчаслівы выпадак, калі ты проста трапляеш у патрэбнае месца ў патрэбны час.

**— Праўда, што ты не здымаеш вяселлі?**

— Не, гэта няпраўда. Проста я іх здымаю няшмат, і больш у дакументальным жанры: імкнуся перадаць сапраўдныя эмоцыі, настрой, тое, што адбываецца, без усялякай штучнай пастаноўкі. Мой варыянт падабаецца людзям, бо ў мяне атрымліваецца зафіксаваць святочны дух, атмасферу гэтага дня. У сярэднім, здымаю каля 5 вяселляў у год, і разам з гэтым... каля 20 чалавек адгаворваю, тлумачу, што я ім непатрэбен.

*(Заканчэнне на 4-й стар.«ЧЗ».)*

*Бацькі і дзеці*

# ХТО ЛЕПШЫ: ПАПЯРЭДНІКІ ЦІ СУЧАСНІКІ?

## НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ РАБІЦЬ ВЫСНОВЫ, ШТО МОЛАДЗЬ СТАЛА «НЕ ТАКАЯ»

**З пачатку ліпеня, як вядома, адменены бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога транспарту для навучэнскай і студэнцкай моладзі. Шкада, безумоўна. І ўсё ж адну станоўчую рысу страты такой ільготы я бачу: нараканняў у бок маладых людзей стане менш. Хаця нараканні кшталту «ў наш час моладзь была лепшай» — з'ява, якая была, ёсць і будзе. Чаму так адбываецца? Ці мае рацыю старэйшае пакаленне? Ці сапраўды сёння моладзь «не такая», як была раней, спрабую высветліць у <u>дырэктара Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта, доктара сацыялагічных навук, прафесара Давіда РОТМАНА.</u>**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падчас нашай гутаркі высвятляецца, што прычына такога стаўлення да моладзі відавочная. Старэйшае пакаленне, калі пачынае даваць ацэнку маладым, не ўлічвае акалічнасці, пераўтварэнні, якія адбываюцца з людзьмі, зыходзіць з уласнага погляду, што сфарміраваўся раней, і сваіх традыцый. А свет жа змяніўся!

**— А ці сталі адрозненні паміж пакаленнямі праяўляцца больш выразна? — цікаўлюся ў Давіда Генрыхавіча.**

— Гледзячы якія. Калі гэтыя адрозненні звязаны з авалоданнем сучаснымі тэхналогіямі, то так. Што тычыцца змен унутры чалавека, усё адбываецца павольна. Прыгадаем біблейскі сюжэт: Маісей вадзіў іўдзеяў па пустыні 40 гадоў, каб вытравіць з іх пачуццё раба — за гэты час павінна было змяніцца два пакаленні... У буйным праекце «Еўрапейскія каштоўнасці», у якім мы ўдзельнічаем, мы вызначылі некалькі груп для даследавання, розніца паміж якімі складае 20 гадоў (за гэты час і змяняецца пакаленне). Звесткі параўноўвалі за 1990 — 2008 гады. І высветлілася, што розніцы паміж базавымі каштоўнасцямі (сям'я, работа, вольны час, стасункі паміж людзьмі, сяброўства, рэлігія і палітыка) у пакаленняў амаль няма. Глядзіце: у 1990 годзе ў даследаваннях удзельнічалі людзі, якія раслі ў Савецкім Саюзе. А ўжо мінула амаль 20 гадоў, як Беларусь стала незалежнай. Па-ранейшаму галоўнай каштоўнасцю застаецца сям'я. Змены адбыліся толькі ў стаўленні да палітыкі і рэлігіі: цікавасць да першай пачала зніжацца, да другой, наадварот стала расці. І падобная раскладка сістэмы каштоўнасцяў характэрна і для іншых краін.

**— Атрымліваецца, сучасная моладзь не так ужо і адрозніваецца ад сваіх папярэднікаў?**

— Інтарэсы маладых людзей хутка змяняюцца, патрэбы растуць... Ёсць закон узрастання патрэб, гэта натуральна, што яны хочуць больш зарабляць, больш ведаць, атрымліваць лепшую адукацыю, падарожнічаць. Але ўнутры чалавек не мяняецца. Безумоўна, інтэрнэт уплывае на людзей. Сціраюцца межы. Калі раней людзі былі насельніцтвам пэўнай краіны, грамадства, то зараз становяцца больш грамадзянамі свету. І тым не менш прывязанасць да роднай зямлі застаецца вельмі моцнай. 2-3 гады таму мы праводзілі даследаванні наконт таго, якія ўмовы неабходныя для вяртання вучоных, якія працуюць за мяжой, назад у Беларусь. Пераважная большасць іх кажа пра тое, што думаюць пра радзіму, што іх цягне дадому, што ім ніякавата, бо туга па радзіме пастаянная.

*(Заканчэнне на 3-й стар.«ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 08 2012 г.

*Ёсць пытанне*

# НАВУЧАЎСЯ НА «БЮДЖЭЦЕ» — ВЯРТАЙ ДЗЯРЖАВЕ ДАЎГІ

**Я з'яўляюся выпускніком БДУ бюджэтнай формы навучання. Яшчэ вясной атрымаў размеркаванне на працу, а пазней — магістранцкую стыпендыю Варшаўскага ўніверсітэта. Пакуль чакаў афіцыйнага запрашэння, пацікавіўся ў адміністрацыі факультэта: ці не будзе ў мяне праблем з размеркаваннем, бо дзейнічае ж новы Кодэкс аб адукацыі?Але там мяне заспакоілі і параілі звярнуцца з запрашэннем на навучанне ва ўніверсітэцкі аддзел кадраў. І вось там ужо я даведаўся, што ехаць вучыцца ў Польшчу я магу, толькі кампенсаваўшы ў бюджэт выдаткаваныя на маё навучанне сродкі (за пяць гадоў). У сувязі з гэтым у мяне ўзнікла цалкам заканамернае пытанне: няўжо, паводле новага Кодэкса, беларусам, якія дзякуючы сваім здольнасцям змаглі паступіць на «бюджэт», шлях да наступнай еўрапейскай адукацыі цяпер закрыты як мінімум на 2 гады? Мяркую, што адказ будзе цікавы многім...**

**Віталь.**

Як расказаў журналісту «Звязды» **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА,** у Цэнтральны камітэт галіновага прафсаюза паступае шмат пытанняў як ад выпускнікоў устаноў адукацыі, так і ад наймальнікаў. Гэтыя пытанні датычацца навучання маладых спецыялістаў і маладых рабочых (служачых) на больш высокай ступені навучання, у тым ліку і ў замежных ВНУ:

— Згодна з пунктам 29 Палажэння аб парадку размеркавання, выпускнікі, якія атрымалі пасведчанне аб накіраванні на працу, але да ўказанага ў пасведчанні тэрміну прыбыцця ў арганізацыю былі залічаны на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў у дзённай форме атрымання адукацыі на больш высокі ўзровень (ступень) адукацыі, абавязаны на працягу трох дзён пасля залічэння пісьмова паведаміць аб сваім залічэнні наймальніку, ва ўстанову адукацыі і вярнуць пасведчанне аб накіраванні на працу ва ўстанову адукацыі.

Хачу падкрэсліць, што пры паступленні ва ўстанову адукацыі павінны захоўвацца чатыры асноўныя ўмовы, каб размеркаванаму выпускніку не давялося вяртаць у бюджэт сродкі за сваё навучанне. Па-першае, паступіць неабходна ў год заканчэння ўстановы адукацыі. Па-другое, гэта павінна быць навучанне на больш высокім узроўні (ступені) адукацыі. Па-трэцяе — навучанне павінна праходзіць за кошт бюджэтных сродкаў. Па-чацвёртае, дапускаецца толькі дзённая форма атрымання адукацыі.

Паступленне ў "платную" магістратуру пасля бюджэтнага навучання ў ВНУ зараз магчыма толькі пасля адпрацоўкі па выніках навучання на першай ступені ці пасля вяртання сродкаў у адпаведнасці з неадпрацаваным тэрмінам, паколькі малаверагодна, што маладому чалавеку ўдасца сумяшчаць працу па размеркаванні і навучанне на дзённым аддзяленні магістратуры. Хоць такая магчымасць таксама не выключаецца. Паступіць на платную форму навучання ў ВНУ пасля заканчэння бюджэтнай формы навучання ў ССНУ таксама можна толькі пасля адпрацоўкі па размеркаванні. Тое ж датычыцца і навучання на платнай форме ў сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе, калі малады чалавек паступае ў ССНУ адразу пасля заканчэння прафесійна-тэхнічнай установы.

Калі навучацца за мяжу выпускніка накіравала не тая ўстанова адукацыі, якую ён скончыў, і яго навучанне ажыццяўляецца не за бюджэтныя сродкі, то ў гэтым выпадку выпускнік, які пажадае атрымліваць адукацыю за мяжой, трэба будзе вярнуць дзяржаве сродкі за ўсе гады свайго бясплатнага навучання або спачатку адпрацаваць па размеркаванні два гады, а ўжо затым думаць пра атрыманне адукацыі за мяжой.

Раман Дапіра таксама дадаў, што Цэнтральны камітэт галіновага прафсаюза ў рамках маніторынгу рэалізацыі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі звярнуўся ў Міністэрства адукацыі з прапановай аб урэгуляванні заканадаўствам пытання прадастаўлення выпускнікам, якія паступаюць на платную форму навучання, магчымасці абавязковай работы ў адпаведнасці з пасведчаннем аб накіраванні на работу ці вяртання выдаткаваных на іх падрыхтоўку сродкаў **пасля завяршэння імі навучання на больш высокай ступені адукацыі.** Прасцей кажучы, размова ідзе пра адтэрміноўку, а не пра вызваленне маладых людзей, якія атрымлівалі адукацыю за бюджэтныя сродкі, ад сваіх абавязкаў перад дзяржавай...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*Зачапіла!*

# МЕНЗУРКА ЦІ МАЗУРКА?

## або Да чаго прывялі пошукі адказу на заданне ЦТ па матэматыцы

**9 жніўня ў «Звяздзе» быў апублікаваны артыкул «Веды без ўмення іх прымяніць — як чамадан без ручкі». У прыватнасці, у артыкуле згадвалася канкрэтная задача з сёлетняга цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы, з якой не змагло справіцца каля 60% абітурыентаў: «На адной чашы ўраўнаважаных вагаў ляжаць 3 яблыкі і 1 груша. На другой — 2 яблыкі, 2 грушы і гірка вагой 20 грамаў. Колькі важыць адзін яблык (у грамах), калі ўся садавіна разам важыць 780 грамаў?» А побач былі прадстаўлены пяць варыянтаў адказаў: 1) 95; 2) 105; 3) 100; 4) 125; 5) 115. Прыводзілася таксама задача пра раўнабедраныя вуглы трохвугольніка і заданне на вызначэнне прыбора для вымярэння аб'ёму цела (зноў такі з варыянтамі адказаў). Ад абітурыентаў патрабавалася апазнаць сярод прапанаваных прыбораў мензурку. Відаць па ўсім, артыкул шмат каго зачапіў, ва ўсялякім разе ў інтэрнэт-прасторы многія кінуліся рашаць задачку, якая абітурыентам была не пад сілу. Што з гэтага атрымалася? Цытуем:**

@ **Йа крэведка:**
Ва ўказанай задачы па матэматыцы ў мяне атрымалася, што вага яблыка — 200 грамаў, грушы — 180 грамаў. Але такога адказу няма сярод прапанаваных у тэсце!

@ **sadnikofd:**
105. Факт. Задача на пару хвілін. Куды мы коцімся!!

@ **saykl**:
Школу скончыў 8 гадоў назад, але ўсё яшчэ памятаю. Сістэма ўраўненняў з двума невядомымі. Адказ — 105. Праўда, напрыканцы дзяліў калькулятарам)))

@ **alisonfelix:**
Не замарочвайце сабе галаву. Тое, што трэба дзецям рашыць, каб набраць добрыя балы на ЦТ, звычайнаму чалавеку не пад сілу. А гэтая задачка — просты ўзор таго, чаму некаторыя дзеці не могуць набраць нават 7 балаў.

@ **merchant2012:**
Якая ганьба, калі б у мяне былі такія задачы пры паступленні 15 гадоў таму!!! Як можна атрымаць 10 балаў у школе (па-ранейшаму — «пяцёрку») і не рашыць сістэму з двух ураўненняў? А назвы прыбораў — гэта што, задача? Лепш вучыць аднаго і ўдзяляць яму ўвагу, чым распыляцца на кучу невукаў!

@ **Simoren:**
Такія задачы павінны рашацца ўвогуле ў галаве.

@ **turumtumtum:**
Не рашаў такія задачы ўжо 6 гадоў, але справіўся за 2 хвіліны. А задача з вугламі рашаецца ўвогуле за хвіліну. Яны што, зусім невукі?

@ **Deyzi:**
Мне 11 гадоў і я рашыў задачу за тры хвіліны. Адказ — 105.

@ **AGAINST:**
Проста сорамна робіцца за нашу школу....Здаваў ЦТ неаднойчы (было проста цікава). Заданні год ад года ўсё лягчэй і лягчэй, а сярэднія вынікі — наадварот, імкнуцца ўніз. Дзеці проста развучыліся працаваць галавой? А потым яшчэ будуць скардзіцца бацькам, што заданні цяжкія...

@ **Simoren:**
Я лічу, што трэба ўвесці спецпатрабаванне па абавязковым рашэнні пэўных задач: калі абітурыент не рашыў хоць адну з гэтых задач, то ён аўтаматычна выбывае.

@ **pupsichek:**
Калі я здавала ЦТ (2007 г), заданні былі вельмі складаныя. Частка В змяшчала задачы ўніверсітэцкіх алімпіяд (гэта тычыцца і матэматыкі, і замежнай мовы). І рашалі, і паступалі. І прахадны бал ва ўніверсітэце быў не 150-170, як цяпер, а 330-360. А сённяшнія тэсты не выходзяць за рамкі школьнай праграмы, а вынікі ўсё горшыя. І справа не ў тым, што падрыхтоўка ў школе — дрэнная (хоць і гэта таксама праўда, таму што настаўнікаў прымушаюць рабіць усё, што заўгодна — рамонты, патруляванне ў парках і г.д., але толькі не займацца тым, на што яны вучыліся і да чаго імкнуліся), а яшчэ і ў тым, што псіхалогія ў цяперашніх школьнікаў/абітурыентаў зусім іншая, як і іх інтарэсы.

**Дзеці проста развучыліся працаваць галавой! А потым яшчэ будуць скардзіцца бацькам, што заданні цяжкія...**

@ **Mike216:**
Сапраўды, у 2007—2008 гадах тэсты былі добрыя. Я здаваў ЦТ у 2008 годзе, і калі 60% здалі матэматыку менш чым на 20 балаў, то ніжні бал увогуле адмянілі. А я спачатку палічыў, што заваліў матэматыку, набраўшы 65 балаў, і сумаваў з гэтай нагоды, таму што на рэпетыцыйных тэстах было 80 балаў і больш. На маю спецыяльнасць у БДЭУ прахадны бал на платнае аддзяленне быў каля 260, а на бясплатнае ўвогуле маўчу — там 300 балаў і больш. У мяне ў групе двое аднакурснікаў нават 100 балаў атрымалі на тэсціраванні па матэматыцы.

@ **oOFlyAngelOo:**
Як у гэтай элементарнай задачы для 9 класа можна памыліцца? Хоць, калі меркаваць па каментарыях, то мне вельмі страшна робіцца за адукацыю.

@ **alesik01:**
Прачытаўшы большую частку водгукаў, бачу, што некаторым спатрэбіўся час, а каму і дапамога. А цяпер уявіце сабе, што такіх задач — дзясяткі, у вас абмежаваны час на іх выкананне, плюс сваякі за дзвярыма нервуюцца і сам абітурыент на валяр'янцы. 40% тых, хто рашыў, хутчэй за ўсё, займаліся з рэпетытарамі. Так на каго экзамены разлічаны — на адукацыю з рэпетытарамі або на звычайную школу?

@ **Zhentos100:**
Я спадзяюся, што ўсе, хто тут прывёў ход рашэння і аспрэчваў спосабы рашэння гэтых задач, — вучні школ. Інакш боязна за псіхалагічны стан людзей, якія спрабуюць камусьці штосьці даказаць на прыкладзе задачы ўзроўню 4 класа пачатковай школы.

@ **FCbarsa:**
Я вось аб чым падумаў, так бы мовіць, у абарону абітурыентаў. Магчыма, яны і не спрабавалі рашаць, а проста расставілі адказы за 5 хвілін, імкнучыся ўгадаць адказ, і пашлі. Калі я 9 гадоў таму здаваў тэсціраванне, то такія абітурыенты дакладна былі.

@ **toDeng:**
Былі такія і ў гэтым годзе. Мой брат гэта таксама зрабіў. Не ведаю, аб чым ён думаў?

@ **vadikl:**
Хутчэй за ўсё, справа не ў школе, ці не толькі ў ёй. А ці многія з бацькоў зараз гуляюць з дзецьмі ў шахматы, разгадваюць крыжаванкі, ды проста чытаюць кнігі!!! А гэта ж усё стымулюе інтэлектуальное развіццё. Ці бацькоў цалкам задавальняе, што іх дзіця вечарамі "завісае" ў камп'ютары або тыкае на кнопкі тэлефона?

@ **Vitalius:**
Ну вы даяце: мензурка — гэта танец такі)))

@ **sa-si:**
Танец называецца не мензурка, а мазурка.

@ **Olena323:**
Ну што вы да мензуркі прычапіліся? Можа, чалавек у такой школе вучыўся, дзе хімічныя доследы ў паўлітровых слоіках праводзіліся, а рэактывы адмыралі каўпачком ад апаласквальніку.

@ **Leif:**
Усім гора-абітурыентам тэрмінова выдаць па мензурцы і 100 мл "баявых" для суцяшэння!

@ **Max182:**
Хачу заўважыць, што 2012 — першы год, калі Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў не агучыў сярэдні бал ЦТ. У якасці статыстыкі нам паведамілі, колькі чалавек набралі 100 балаў і колькі не набралі 7 балаў. У папярэднія гады паказчык сярэдняга бала пастаянна зніжаўся, а сёлета гэтыя звесткі ад усіх проста ўтойвалі. Хутчэй за ўсё, сітуацыя — зусім сумная. Асабліва па фізіцы.

@ **alisonfelix:**
За 2011 год аналіз апублікавалі 6 ліпеня 2011 года. У гэтым годзе выхваляліся вялікай колькасцю стабальнікаў. Але калі ні 6-га, ні 10 ліпеня аналіз ЦТ не з'явіўся ў друку, я зрабіла такую ж выснову. Статыстыка існуе для таго, каб дэманстраваць відавочныя поспехі, а на ЦТ такіх поспехаў, відаць па ўсім, не назіралася.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ХТО ЛЕПШЫ: ПАПЯРЭДНІКІ ЦІ СУЧАСНІКІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**— Ці стала беларуская моладзь больш цікавіцца гісторыяй і культурай сваёй краіны?**

— Сёння, на мой погляд, людзі хочуць адчуваць сябе беларусамі. У тым ліку і таму, што яны сустракаюцца з замежным жыхарамі, якія гавораць на сваіх мовах, даведваюцца пра іншыя культуры.

**— А што можна сказаць пра стаўленне да беларускай мовы?**

— Тут складаней. Людзі часта утойваюць сваё жаданне гаварыць па-беларуску з-за няведання мовы. Калі чалавек не валодае мовай добра, яму няёмка, ён не хоча паказаць свае памылкі, ён пачынае рабіць выгляд, што яму гэта не вельмі і трэба. У нас былі даследаванні, звязаныя з беларускай мовай, і тут ёсць пазітыўная тэндэнцыя: жаданне гаварыць на ёй павялічваецца. Але падчас даследаванняў было і такое, што людзі, якія нядрэнна валодаюць беларускай мовай, баяліся прызнацца ў гэтым і на ўсялякі выпадак, пазначалі, што гавораць на «трасянцы».

**— Ідучы па вуліцы, едучы ў транспарце, назіраю за суайчыннікамі і заўважаю, што сёння вельмі рэдка можна ўбачыць маладых людзей, якія ўсміхаліся б. Хіба моладзь стала больш занятая, засяроджаная на пытаннях кшталту, як зарабіць грошы, прабіцца ў жыцці і г.д.?**

— Сапраўды моладзь стала больш сур'ёзнай, больш мэтанакіраванай, самастойнай. Людзі ў больш маладзейшым узросце пачынаюць думаць, як яны змогуць у будучым забяспечыць сябе і сваю сям'ю. Пры гэтым моладзь разлічвае толькі на ўласныя сілы. Спаборніцтва, супастаўленне сябе з іншымі, імкненне быць не горш — гэта якраз і ёсць стымул для таго, каб развівалася чалавецтва.

**— Ці не з'яўляюцца сучасныя маладыя людзі і больш распешчанымі? Пакаленне іх бацькоў вырасла ў савецкі час, але сваім дзецям яны пасталіся даць усё, чаго былі пазбаўлены самі. Ці не сапсавалі яны такім чынам моладзь?**

— Можна з гэтым пагадзіцца. Але гэта можа быць праблема аднаго-двух пакаленняў. Такім чынам бацькі павышаюць запыты нашчадкаў. Але далей «сапсаваныя» дзеці будуць самі шукаць магчымасці, каб жыць не горш. Шукаць шляхі, як больш зарабіць, атрымаць прызнанне. Праз некалькі пакаленняў гэтае жаданне стабілізуецца, стане пастаянным, што будзе спрыяць пастаяннаму развіццю.

**— Якія прагнозы на будучае можна зрабіць, выкарыстоўваючы вынікі сацыялагічных апытанняў?**

— Усё больш маладых людзей будзе імкнуцца атрымліваць вышэйшую адукацыю.

Ужо сёння чатыры пятых школьнікаў плануюць сваё паступленне ў ВНУ. Іншая справа, што яны шукаюць больш просты шлях. Выпускнікі стараюцца выбіраць тыя спецыяльнасці, якія (як ім падаецца) найбольш даступныя. Большасць выбірае гуманітарныя навукі, бо памылкова лічыць, што сёння здаць іспыты, напрыклад, па такіх дысцыплінах, як фізіка і матэматыка, вельмі складана. Як вынік, на жаль, мала маладых людзей плануюць стаць інжынерамі. Неабходна ўплываць на моладзь, абуджаць цікавасць да тэхнічных спецыяльнасцяў. Тлумачыць, што такая адукацыя таксама даступная, арганізоўваць курсы, каб лепш падрыхтоўваць школьнікаў да іспытаў па матэматыцы і фізіцы. У тым ліку трэба працаваць і з бацькамі. Бацькі дэзарыентуюць моладзь, калі кажуць, што галоўнае — атрымаць вышэйшую адукацыю. Галоўнае — не проста мець дыплом, а атрымаць прафесію, якая будзе запатрабавана, дасць маладому чалавеку магчымасць рэалізавацца, зрабіць кар'еру.

Думаю, сёння не хапае і сацыялагічных даследаванняў — менавіта сістэмных, масавых. Трэба больш вывучаць патрэбы і жаданні школьнікаў, іх планы наконт будучай спецыяльнасці. Калі б была вядомая сітуацыя, куды і колькі дзяцей збіраюцца паступаць, можна было б нейкім чынам ёю кіраваць. Калі б мы загадзя атрымлівалі інфармацыю, што, напрыклад, у пэўным рэгіёне большасць дзяцей зарыентавана на паступленне на адну і тую ж спецыяльнасць, маглі б праводзіць работу па «раскручванні» іншых прафесій і падрыхтоўцы да паступлення ў пэўныя ВНУ. Безумоўна, такія масавыя даследаванні каштуюць грошай, але далей гэта дапаможа сэканоміць, бо мы будзем атрымліваць запатрабаваных спецыялістаў.

Не спяшайцеся рабіць высновы, што моладзь стала «не такая», «бязглуздая» і «лянівая». Паглядзіце на вынікі сацыялагічных даследаванняў, праведзеных Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ. Тут выкарыстаны звесткі з манаграфіі «Каштоўнасны свет сучаснага чалавека. Беларусь у праекце «Даследаванне еўрапейскіх каштоўнасцяў», а таксама інфармацыя, прадстаўленая загадчыкам аддзела Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў, кандыдатам філалагічных навук Аляксандрай Водневай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

❍ Каля 80 працэнтаў маладых людзей настроены на стварэнне сям'і, прычым большасць выступае за афіцыйнае афармленне сваіх адносін, арыентавана на далейшае нараджэнне дзяцей. За два дзесяцігоддзі павялічваецца колькасць (з 14 да 20 працэнтаў) людзей, якія не адмаўляюць грамадзянскага сужыцельства. Але для сябе такую форму адносін хацелі б менш за 14 працэнтаў мужчын і 7 працэнтаў жанчын.

❍ Павялічваецца ўзрост уступлення ў шлюб (у сярэднім для жанчын гэта 24-25 гадоў, для мужчыны 26-27).

❍ Ва ўяўленнях і жаданнях захоўваецца традыцыйны погляд на размеркаванне абавязкаў паміж сужэнцамі ў сям'і. 65-67 працэнтаў лічаць, што мужчына павінен быць здабытчыкам. Але пры гэтым, калі аналізуецца стан размеркавання абавязкаў у сям'і, атрымліваецца, што мужчыны і жанчыны хочуць на роўных удзельнічаць у матэрыяльным забеспячэнні сям'і і ў выкананні сямейных абавязкаў.

❍ Сучасныя дзяўчаты з ідэальным мужам звязваюць не толькі яго здольнасць да здабычы сродкаў, а таксама вернасць, любоў да дзяцей, памяркоўнасць.

❍ Сучасныя маладыя людзі (больш за 70 працэнтаў) адмоўна ставяцца да разводаў.

❍ Расце колькасць маладых людзей, якія лічаць, што праца займае вельмі важнае месца ў іх жыцці (з 36,1% ў 1990 годзе да 52,9% у 2008). Пры гэтым пры выбары працы моладзь (каля 40 працэнтаў) найперш арыентуецца на высокі заробак. Расце і колькасць людзей, якія арыентуюцца на творчую самарэалізацыю, перспектыўную працу. Акрамя таго моладзь звяртае ўвагу на тое, што праца павінна быць цікавай, адказнай.

❍ Узрастае значнасць і такой каштоўнасці, як вольны час. Для большасці гэта магчымасць самарэалізавацца. Па выніках сацыялагічнага даследавання 2008 года, у вольны час хлопцы і дзяўчаты аддаюць перавагу адпачынку (95%), сустрэчам з прыемнымі людзьмі (95%), магчымасці даведацца што-небудзь новае (88%).

23 августа 2012 года в 15.00 состоится
внеочередное собрание акционеров ОАО «Черметремонт»,
место проведения собрания – по месту нахождения Общества:
223017, Минский р-н, п. Гатово,
ОАО «Черметремонт», актовый зал.

Повестка дня:

1). О внесении изменений в Устав Общества.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 14.08.2012. Место и время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 12.00 до 13.50 по месту его проведения.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на внеочередном собрании акционеров представителю. При себе иметь документ, удостоверяющий личность и доверенность (для представителей).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница) с 8.30 до 17.00, начиная с 16.08.2012 в приемной ОАО «Черметремонт», а в день проведения собрания – с 12.00 до 14.50 по месту его проведения.

*УНП 600068756*

**Наблюдательный совет**

*Нашwwінь:)*

# ПРА ГЭТА

## ХТО ЗА ЎСІХ МІЛЕЙШЫ?

**Беларуская плыўчыха Аляксандра Герасіменя** *(на фота)*, **якая падчас сёлетніх Гульняў парадавала заўзятараў двойчы, нават пасля заканчэння спаборніцтваў дала беларусам яшчэ адну падставу для гонару. Наша «сярэбраная рыбка» Саша ўвайшла ў топ-10 самых прыгожых спартсменак СНД па выніках апытання, праведзенага фондам «Інтэграцыя» і маніторынгавым агенцтвам NewsEffector.**



Фота Пятра ФАМІНА.

У апытанні ўзялі ўдзел больш як 17200 чалавек з Расіі, Беларусі, Украіны, Казахстана, Малдовы, Арменіі, Азербайджана, Узбекістана і Кіргізіі. На 1 месцы неафіцыйнага першынства прыгажунь апынулася Караліна Севасцьянава, якая прадстаўляла Расію ў групавым мнагабор'і па мастацкай гімнастыцы; следам ідзе шэраг гімнастак з розных краін. Аляксандра Герасіменя — на 7 месцы гэтага суб'ектыўнага рэйтынгу (з чым суайчыннікі, не сумняваюся, могуць паспрачацца). Што цікава, у дзясятку самых прыгожых спартсменак трапілі некалькі дзяўчат, якія высокіх спартыўных дасягненняў у Лондане не прадэманстравалі. Я, напрыклад, таксама асабіста ведаю некалькіх «заўзятараў», якія глядзяць мастацкую гімнастыку і пляжны валейбол, зважаючы зусім не на майстэрства гульні, прыгажосць асобных элементаў і выніковыя балы, а на ножкі «і ўсё такое» спартсменак...

## О, СПОРТ, ТЫ... БОРШЧ!

**Менавіта такую нечаканую аналогію правялі псіхолагі Аляксандр і Тамара Балыкіны, якія рыхтавалі да Алімпіяды-2012 расійскую зборную па боксе. Як і папулярная першая страва, перамога на Алімпіядзе, сцвярджаюць спадары Балыкіны, з'яўляецца вынікам пэўных паслядоўных дзеянняў.**

Для пачатку, адзначылі псіхолагі, трэба ведаць, што такое боршч і чым ён адрозніваецца, скажам, ад кашы ці капусты. Пасля неабходныя якасныя рэсурсы (абсталяванне і інгрэдыенты), а яны, у сваю чаргу, вымагаюць грашовых выдаткаў. Таксама трэба ведаць рэцэпт і мець пэўны навык гатавання. Нарэшце, неабходная матывацыя — «імпэт ды жаданне, каб зварыць боршч». Спартыўная індустрыя, безумоўна, больш складаная, але прынцып дасягнення поспеху ў ёй зусім гэткі ж, сцвярджаюць Балыкіны.

Пры ўсёй арыгінальнасці тэорыі яе стваральнікі не ўлічылі шэраг важных акалічнасцяў. Напрыклад, наўрад ці нават самы тонкі гурман, 8 гадоў таму пакаштаваўшы баршчу, раптам узгадае, што ў ім быў глютамат натрыю замест 3 лыжак булёну і белы перац замест чырвонага. Дый повару, які гатаваў той злашчасны боршч, наўрад ці загадаюць пакінуць кухню на некалькі гадоў...

## У ЛОНДАН — ПРАЗ ЛОЖАК

**Новазеландскаму тхэквандысту Логану Кэмпбелу дзеля таго, каб годна падрыхтавацца да Алімпійскіх гульняў у Лондане (і ўвогуле патрапіць на іх), давялося адкрыць у сябе на радзіме ў Оклендзе публічны дом.**

Такое неадназначнае рашэнне спартсмену прадыктавала зусім не ўласная сквапнасць, а жорсткія рэаліі: трэніроўкі, экіпіроўка і праезд на папярэднія Гульні ў Пекіне «з'елі» з банкаўскіх рахункаў Кэмпбела ні многа ні мала, а 120 тысяч долараў. Алімпіяда-2012, як загадзя падлічыў спартсмен, вымагала як мінімум 300 тысяч новазеландскіх, або каля 220 тысяч амерыканскіх долараў. У яго такой сумы не было, а прасіць у бацькоў не дазваляла пачуццё ўласнай годнасці.

Нягледзячы на тое, што ў Новай Зеландыі бізнэс «лёгкіх паводзін» цалкам легальны, тамтэйшыя чыноўнікі ад спорту, зразумела, не прыйшлі ў захапленне ад такога спосабу зарабіць. Алімпійскі камітэт усяляк сарамаціў Кэмпбела, які нібыта ганьбіць алімпійскі рух і псуе імідж краіны, і нават пагражаў судом. Тым не менш, у 2009 годзе ўпарты тхэквандыст адкрыў «клуб класа люкс для джэнтльменаў» з 14 пакоямі і нават сам рэкламаваў гэтую ўстанову на ўласным сайце. Праз два гады публічны дом, саслужыўшы сваю службу, быў прададзены, а спартсмен усё ж прабіўся ў нацыянальную зборную. Праўда, бліскучых перамог на Алімпіядзе Логан Кэмпбел не паказаў — не здолеў выйсці з 1/8 фіналу, але байцоўскі характар і волю да перамогі прадэманстраваў дакладна. Хоць і шкада, што малады чалавек не «ўмыў» функцыянераў канчаткова, заваяваўшы медаль той ці іншай вартасці.

## НАДЫХАЦЦА АЛІМПІЯДАЙ

**Вы яшчэ не гатовы змірыцца з тым, што ў Алімпійскіх гульнях-2012 пастаўлена тлустая кропка? Момант расстання з атмасферай Гульняў можна адцягнуць — напрыклад, набыўшы на інтэрнэт-аўкцыёне Ebay бутэльку з паветрам Лондана.**

На момант закрыцця Алімпіяды максімальная цана, якую пакупнікі былі згодны заплаціць за падобныя лоты, не перавышала 11 фунтаў (каля 130 тысяч беларускіх рублёў), у той час як запыт прадаўцоў складаў ад 49 фунтаў (прыкладна 600 тысяч рублёў) да 99,99 фунта (амаль 1,3 млн рублёў). Зрэшты, асаблівым попытам бутэлькі з паветрам, «набраным» на ўваходзе ў Алімпійскі парк, не карысталіся, у адрозненне ад традыцыйных сувеніраў з 5 кольцамі — футболак, кепак і нават алімпійскіх факелаў. Цана апошніх, між іншым, дасягала 160 тысяч долараў за шутку, але ўдзельнікі эстафеты маглі набыць факел са значнай зніжкай — за 340 долараў.

Ну нічога святога няма ў некаторых людзей — каб іх рукі дацягнуліся да Алімпа! Здаецца, яны і багоў бы распрадалі па кавалачках!

**Дзяжурыла па сеціве Вікторыя ЗАХАРАВА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 08 2012 г.

# АНТОН МАТОЛЬКА: ЖЫЦЦЁ Ў РУХУ


Прыгажуні таксама плачуць. (Пераможца конкурсу «Міс свету-2010».)

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

**— ???**

— Ну вось, напрыклад, прыходзяць да мяне людзі і пытаюцца, ці здымаю вяселлі. Я кажу: «Так, фатаграфую, але ў рэпартажным стылі». Пасля цікаўлюся, што ў іх запланавана на гэты дзень. Мне кажуць: «ЗАГС, прагулка, рэстаран». «А хто вас будзе здымаць на прагулцы?» А мне ў адказ: «Ну як? Вы!» «Добра. А што вы будзеце рабіць у гэты прамежак часу?» І тут чую: «Ну, мы не ведаем, вы ж нас паставіце якнебудзь...» Так, я пастаўлю, аднак, на маю думку, працэй запрасіць фатографа, які займаецца менавіта пастановачнымі фотасесіямі, таму і прапаноўваю іншых калег. Трапіць на сапраўды цікавыя вяселлі даволі складана, іх трэба шукаць, прыкладаць шмат намаганняў. Магу сказаць, што ў сярэднім на год выпадае толькі адно незвычайнае вяселле. Самае першае ў мяне было, калі здымаў маладых дызайнераў, якія падчас вяселля «пераварнулі» палову сталіцы, а другое прайшло на хіперскіх аўтобусах-жучках 1960-х гадоў. Атрымалася вельмі пазітыўна і здорава! Я зарадзіўся такой энергіяй, як і ўсе госці.

**— У цябе ёсць любімыя месцы, дзе асабліва падабаецца здымаць?**

— Ёсць, але на тое яны і любімыя, каб пра іх не расказваць. Гэта «класіка» ўсіх фатографаў: «не адкрываць» свае месцы, таму што можа з'явіцца сур'ёзная праблема. Напрыклад, прыедзеш да Тэатра оперы і балета, а там ўжо чарга з шасці вяселляў. Безумоўна, гэта весела і здорава, але не тады, калі ў цябе мала часу. Прыгожае месца — «Мінск-Арэна», бо там ёсць шкло, люстэркі, геаметрычныя фігуры, якія можна абыграць. Аднак і гэта становіцца ўжо трохі зацяганым і збітым, бо такое ўжо было ва ўсіх!

**— Дзе табе працаваць прыемней — у студыі ці за яе межамі?**

— Мне, як рэпартажніку, працаваць пры наяўнасці натуральнага святла і вялікай прасторы, таму студыя падыходзіць не заўсёды. Там патрэбна ўвесь час набіваць руку, наступаць на адны і тыя ж граблі... Зразумела, часам я здымаю ў студыі, але гэта не такія «аб'ёмы», каб пра іх казаць.

**— Якія рэпартажы запомніліся больш за ўсё?**

— Здымкі наступстваў тэракту ў Мінскім метрапалітэне, але пра гэта казаць вельмі цяжка... Запомніліся і сталічныя «маўклівыя» акцыі — менавіта накалам эмоцый, часам для мяне незразумелых.

**— Які фотаздымак, на тваю думку, можна лічыць добрым?**

— Той, які выклікае эмоцыі...

**— А каго можна назваць фатографам-прафесіяналам?**

— Прафесіянал — гэта чалавек, які працуе ў любых умовах і зарабляе дзякуючы свайму занятку добрыя грошы. Ён якасна выконвае працу незалежна ад свайго настрою і асабістых праблем. Беларускіх прафесіяналаў-фатографаў шмат. Напрыклад, з рэпартажнікаў гэта Сяргей Грыц, Віктар Грачоў, Таццяна Дзяньковіч, Вадзім Заміроўскі, Вольга Кляшчук, Анатоль Кляшчук... А ёсць яшчэ выдатныя гламуршчыкі, фатографы вяселляў...

**— Як лічыш, чым твае фотаздымкі адрозніваюцца ад работ іншых фатографаў?**

— Ну, напрыклад, апошнім часам я здымаю на мабільны тэлефон. Ён заўсёды са мной, а як вядома, самыя цікавыя фотаздымкі атрымліваюцца знянацку. Фотаапарат увесь час не будзеш з сабою насіць, бо ён цяжкі, нязручны і яго ўсе бачаць. А з дапамогай тэлефона могуць атрымацца цікавыя кадры.

**— Як ставішся да крытыкі?**

— Калі гэта канструктыўная крытыка, якая бывае, на жаль, вельмі рэдка, я да яе прыслухоўваюся. Магу не адразу яе прыняць, магу ўвогуле не прыняць, аднак заўсёды выслухаю. А калі, напрыклад, у інтэрнэце ідзе паток негатыўный пісаніны, то я не звяртаю на яе ўвагу. Які сэнс? Свае памылкі я і сам разумею, аднак пакуль не ведаю, як іх выправіць. Трэба вучыцца, на маю думку, яшчэ як мінімум гадоў дзесяць. У мяне ўжо няма жадання рабіць звычайныя рэпартажы. Імкнуся зафіксаваць нешта незвычайнае і пазітыўнае, бо негатыву ў нашым жыцці і так дастаткова.

**— У цябе шмат партрэтных фота. Як лічыш, што самае галоўнае ў гэтым жанры?**

— Партрэты ў мяне таксама, хутчэй, не пастановачнага, а рэпартажнага характару, знятыя знянацку. Трэба, каб усё ішло само па сабе, а я ўжо фіксаваў бы якія-небудзь эмоцыі ў вачах, на тварах... Не магу «ставіць» чалавека так, каб атрымалася прыгожа. Мне працэй са ста кадраў вылавіць адно адлюстраванне эмоцыі, чым зрабіць пяць пастановачных фотаздымкаў.

**— Ты, дарэчы, сам здымаўся ў рэкламе мабільнай сувязі. Што складаней: быць за аб'ектывам ці перад ім?**

— Ну, рэкламны вопыт быў аматарскай справай, таму гэта цяжка назваць вопытам. Гэта было як хобі, прыемныя змены ў прывычным руху жыцця.

**— Задумваўся наконт таго, чым бы займаўся, калі б не праца фатографа?**

— На працягу апошняга года я падарожнічаю. Пабываў у Азіі, нядаўна вярнуўся з Закаўказзя, вандраваў па Еўропе. Планую, калі атрымаецца, павандраваць па Беларусі, бо Кітай, Тайвань і Інданезія — гэта, безумоўна, здарова, аднак і ў нашай краіне ёсць на што паглядзець. Шчыра спадзяюся, што вандроўка будзе цікавай... Таму, напэўна, заняўся б падарожжамі.

**— У якой краіне спадабалася больш за ўсё?**

— Цяжка адказаць: кожная краіна чымсьці адрозніваецца ад іншых. Вельмі запалі ў душу Іспанія і Чэхія...


За гадзіну да адкрыцця... (Першая ў Беларусі крама са статусам Apple Premium Reseller: i-Store.)

З'ездзіць на месяц у Кітай я жадаю кожнаму беларусу. У Закаўказзе трэба адправіцца, каб адчуць, што такое сапраўдная гасціннасць. Паездка ў Еўропу карысная для пераймання некаторых падыходаў да бізнэсу. Я лічу, што пабываць трэба ўсюды, каб было з чым параўноўваць сваю краіну.

**— Куды плануеш адправіцца ў Беларусі? Ёсць канкрэтны маршрут?**

— Проста хачу ў які-небудзь чароўны дзень выехаць з Мінска, напісаць у Twitter ці Facebook: «Людзі! Я паехаў! Мой першы горад — Салігорск!» А там знойдзецца чалавек, які пакажа мне класныя месцы. Вось у такім фармаце хачу арганізаваць падарожжа. Ехаць туды, куды вочы глядзяць, — усё роўна, на машыне ці на скутары. Хачу знайсці прыгожыя месцы, пра якія мала хто ведае. Напрыклад, кавярні ці паркі, вакол якіх людзі праходзяць, не думаючы, якую прыгажосць яны абмінаюць...


Затапленне Нямігі ў Мінску (лета 2009 г.)

**Крысціна ШАЛАМІЦКАЯ.**
**Фота з асабістага архіва Антона МАТОЛЬКІ.**

# ГРАФІЦІ: ВАНДАЛІЗМ ЦІ МАСТАЦТВА?

**На будынках, гаражах, агароджах часта можна сустрэць не заўсёды зразумелыя малюнкі і надпісы. Такое мастацтва называецца «графіці», а аўтараў падобных «шэдэўраў» называюць райтарамі. Паводле электроннай энцыклапедыі «Вікіпедыя», «графіці — гэта выявы, малюнкі ці надпісы, якія выдрапалі, напісалі ці намалявалі краскай або чарніламі на сценах і іншых паверхнях. Да такога напрамку можна аднесці любы від вулічнага мастацтва: ад проста напісанага слова да вытанчаных карцін».**

Што ўяўляе сабой сучаснае мастацтва графіці? «Мы звычайна малюем сваё імя (нік-нэйм), якое прыдумляем самі і пасля пераносім яго на паверхню, — расказвае **мінскі мастак графіці ЖеніFERS**. — Яшчэ малюем розных персанажаў, людзей, герояў з мультфільмаў. Графіці — гэта ідэі і розныя незвычайныя рашэнні. Цікавыя моманты і натхненне можна чэрпаць адусюль: з дызайну аўто, з любой сферы мастацтва і нават з прыроды».

## СТЫЛІ

Самы распаўсюджаны стыль графіці заключаецца ў маляванні свайго асабістага імя, якое называецца «тэг». Часам тэгі могуць змяшчаць патаемныя паведамленні, ініцыялы каманды райтараў ці іншыя літары.

Яшчэ адзін стыль — **«троў-ап»** (ці, як яго яшчэ называюць, **«бомбінг»**). Такія малюнкі робяць вельмі хутка, у 2-3 колеры, і часам ахвяруюць якасцю дзеля хуткасці.

**«Кусок»** — гэта адно з самых складаных выкананняў імя райтара, якое ўключае больш стылізаваныя літары і багатую палітру колераў. Маляванне «куска» патрабуе шмат часу і павялічвае верагоднасць таго, што мастака... зловяць.

**«Блокбастары»** — вялікія «кускі», якія выконваюць для пакрыцця вялікай паверхні з выкарыстаннем двух кантрасных колераў. Каб стварыць «блокбастар», патрэбен валік і вялікая колькасць таннай фарбы.

Галоўныя рысы стылю **«wildstyle»** — спляценне літар і вострыя вуглы. Часам прачытаць, што намалявана, немагчыма. Малюнак мае дзікі, выбухны і незразумелы характар.

## МЕСЦА

У Беларусі першыя малюнкі ў стылі графіці з'явіліся ў пачатку 1990-х гадоў, а пік прыпаў на перыяд з 1997-га па 2005 год. У той час у Мінску было некалькі афіцыйных месцаў, дзе райдарам было дазволена маляваць.

Сёння афіцыйных месцаў для нанясення графіці-малюнкаў у Мінску не надта шмат, таму вельмі часта сваю «творчасць» райтары вымушаны пакідаць там, дзе знайшлася свабодная паверхня. «Свой першы малюнак я зрабіў у 2007 годзе на агароджы вуліцы Кульман, — расказвае ЖеніFERS. — Гэта было нелегальна, таму прыйшлося ўставаць у тры гадзіны ночы. Зараз маляваць можна ў Севастопальскім парку, на сцянах каля спартыўнага комплексу «Алімпіец», аднак там ужо амаль не засталося свабоднага месца. Можна, вядома, паехаць і ў іншы горад... Малюючы (таксама нелегальна) і на сценах закінутых будынкаў, аднак гэта небяспечна».

Сапраўды, месцаў для вулічнага мастацтва ў Мінску мала... Спіс дазволеных для малявання будынкаў яшчэ зацвярджаецца, аднак на некаторых ужо зараз можна пакінуць свой нік-нэйм. Адно з іх знаходзіцца ў барачным квартале на вуліцы Нававіленскай, другое — на вуліцы Куйбышава.

Даволі часта райтары збіраюцца на фестывалі. Напрыклад, ідэя фестывалю графіці «СценаГрафія» наступная: замест вулічнага хуліганства — сацыяльны праект, замест подпісаў, якія псуюць фасады будынкаў — маляўнічыя карціны ў стылі графіці. Удзельнікам фестывалю прадастаўляецца не толькі пэўная плошча для творчасці, але і бясплатныя балончыкі з фарбай.

Не мінае Мінск і міжнародны графіці-кантэст «Just Writing My Name». Каб увайсці ў лік удзельнікаў фестывалю, трэба даслаць эскіз малюнка арганізатарам і прайсці адбор.

«Street Instinct» — гэта міжнародны фестываль вулічнага мастацтва, які з нядаўняга часу пачаў праходзіць і ў нашай краіне. У дзень мерапрыемства мастакі без папярэдняй дамоўленасці ствараюць адзіную канцэпцыю і пераносяць яе на сцяну. У фестывалі прымаюць удзел лепшыя райтары з Расіі, Украіны і Беларусі.

## ХУЛІГАНСТВА?

Сёння самая важная спрэчка паміж прадстаўнікамі вулічнага мастацтва і грамадствам заключаецца ў вызначэнні мэты графіці. Што гэта: мастацтва ці хуліганства і вандалізм? «Захапленне графіці ў нашай краіне, у большасці сваёй, незаконнае, — скардзіцца ЖеніFERS. — Райтара могуць аштрафаваць нават у тым месцы, дзе ўсё было размалявана ўжо даўно.

Кожны год у нашай краіне заводзіцца некалькі крымінальных спраў у дачыненні да прыхільнікаў памаляваць на сценах фасадаў будынкаў. Прыцягнуць да адказнасці іх могуць па двух артыкулах — за апаганенне збудаванняў і псаванне маёмасці (арт. 341 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), а таксама за хуліганства (ч.1 арт. 339). За вулічнае мастацтва могуць пасадзіць у турму, даць умоўны тэрмін ці аштрафаваць. ЖеніFERS, размаўляючы са мной, працатаваў аднаго з членаў самай моцнай каманды стрыт-арту: «У нашай краіне графіці не будзе папулярным сярод простых людзей яшчэ гадоў 200, калі не больш. Проста нашы людзі не прывыклі бачыць вулічнае мастацтва...»

**Крысціна ШАЛАМІЦКАЯ.**

Абітурыент — 2012

# Прахадныя балы ў праграмістаў былі амаль фантастычныя

**Абітурыенты з недастаткова высокімі баламі ў сертыфікатах ЦТ па фізіцы і матэматыцы, на жаль, пры прыёме на тэхнічныя спецыяльнасці — будзённая з'ява. Таму і прахадныя балы для ахвотных навучацца ў тэхнічных ВНУ традыцыйна не такія высокія, як сярод «гуманітарыяў». Аднак Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі гэтая праблема закранула ўсё ж такі ў найменшай ступені, ва ўсялякім выпадку яго бюджэтную форму навучання.**

Так, на дзённую бюджэтную форму навучання па тэхніка-тэхналагічным профілі прахадны бал выпускнікоў гарадскіх школ склаў 220 і вышэй, паўпрахадны — 219. Для выпускнікоў сельскіх школ — 210 і вышэй. Па эканамічным профілі — 324 балы і вышэй, а для выпускнікоў сельскіх школ — 259 балаў і вышэй. Таксама сярод залічаных на дзённую бюджэтную форму навучання ў БДУІР — 21 пераможца міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і 1 лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі.

Самыя высокія прахадныя балы былі ў тых, хто паступаў сёлета на спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» — 356, «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» — 343 і «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 333. А ўсяго ў гэтым годзе больш як 30 % абітурыентаў БДУІР набралі 300 балаў і больш.

Усяго на ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі ў БДУІР было залічана сёлета 3 795 абітурыентаў. На дзённае бюджэтнае аддзяленне паступілі 1110 чалавек (у 2011 годзе — 1040), а на дзённае платнае — 805 (у 2011 годзе — 1044). Як бачым, ахвотных атрымліваць адукацыю за свае грошы аказалася значна менш, чым летась. У гэтым годзе ў БДУІР зноў будзе вячэрняя форма навучання. На вячэрнім аддзяленні ўніверсітэта пачне навучанне 61 чалавек, а на дыстанцыйнай — 302 (у 2011 годзе — 269). Пры гэтым 58 чалавек будуць атрымліваць у БДУІР другую вышэйшую адукацыю (у 2011 годзе такіх было 26 чалавек). Таксама вельмі папулярнай аказалася сярод абітурыентаў і скарочаная форма навучання, на якую былі залічаны 826 чалавек. Асобны конкурс праводзіў ваенны факультэт, які прыняў у гэтым годзе 66 курсантаў.

Магістрантамі, якія будуць навучацца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту, сталі 66 чалавек, і 16 чалавек будуць навучацца ў магістратуры на платнай аснове. На завочнае аддзяленне магістратуры паступілі 325 чалавек, з іх на бюджэт — 17 і 308 чалавек — на платную форму навучання.

Нагадаем, што ў 2011 годзе ў БДУІР стартаваў эксперымент па апрабацыі аўтаматызаванай сістэмы залічэння. Пры падачы дакументаў у БДУІР абітурыенты ўказвалі дзве або тры спецыяльнасці ў парадку расстаноўкі ўласных прыярытэтаў. Спачатку абітурыент са сваім наборам сертыфікатаў удзельнічаў у конкурсе на спецыяльнасць, указаную ў прыярытэтах першай, а затым — па другой і трэцяй спецыяльнасцях. У гэтым годзе эксперымент пайшоў далей: абітурыенты ўказвалі пры падачы заявы ўжо не тры, а пяць спецыяльнасцяў: першую — прыярытэтную, а затым чатыры «запасныя». Конкурс праводзіўся ў два этапы па групе спецыяльнасцяў тэхніка-тэхналагічнага і эканамічнага профіляў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Трэці семестр

# СТУДЭНЦКІ ДОСВЕД З ГРАШОВЫМ БОНУСАМ

**Скарыстацца апошнім месяцам лета, каб падзарабіць — ідэя, папулярная сярод моладзі. І студэнты Смілавіцкага аграрнага каледжа сярод тых, хто яе падтрымаў. Будаўнічы атрад у складзе 12 чалавек, сярод якіх 4 дзяўчынкі, працуе на рэканструкцыі фермаў у гаспадарцы ААТ «Крыніца Ігуменшчыны» Чэрвеньскага раёна, якая знаходзіцца ў вёсцы Рудня.**

Навучэнцы заатэхнічнага, ветэрынарнага, пчалаводчага аддзяленняў Смілавіцкага аграрнага каледжа вызваліся паўдзельнічаць у рэалізацыі прэзідэнцкай праграмы рэканструкцыі фермаў. Паводле яе, у кожным раёне павінна быць створана ферма па заходнім прыкладзе. Ідэя каледжа прыняць удзел у рэканструкцыі вылілася ў супрацоўніцтва паміж навучальнай установай і гаспадаркай. Магчыма, гэтае супрацоўніцтва будзе працягвацца і ў далейшым.

— Маладыя людзі, якія ўдзельнічаюць у рэканструкцыі, набываюць вопыт, — расказвае кіраўнік будаўнічага атрада Іван Ярашэвіч. — Для іх гэта працоўная загартоўка, якая вучыць беражліваму стаўленню да таго, што ствараецца ўласнымі рукамі. Бо не выключана, што для некага з іх гэта будзе будучае месца працы.



На добраахвотнай аснове сюды трапілі тыя, хто жадае папрацаваць і падзарабіць. Хлопцы і дзяўчаты на роўных займаюцца рознымі справамі: і цэглу вывозяць, і сцены разбіваюць, і агароджы будуюць. Дзеляцца на дзве брыгады і працуюць кожны дзень ад васьмі да пяці. У нядзелю — выхадны. Ежа і пражыванне ў інтэрнаце ў іх бясплатныя. Але маладыя людзі не задаволены некаторымі момантамі, сярод якіх, напрыклад, адсутнасць гарачай вады. Выратоўваюць чайнікі і тазікі. Акрамя таго, не ўсе маюць спецадзенне, а працаваць даводзіцца ў розных умовах.





Такі вось заробак на летні час, але з экстрымам. Яшчэ колькі дзён студэнты будуць працаваць, сагрэтыя думкай, што іх намаганні адаб'юцца ў грашовым эквіваленце, і набываць вопыт, які можа спатрэбіцца ў далейшым. А потым будуць рыхтавацца да новага навучальнага года.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Чэрвеньскі раён.*

Часовы прытулак

# СВАЕ СЯРОД ЧУЖЫХ, ЧУЖЫЯ СЯРОД СВАІХ

**«Мая мама баіцца разбіць люстэрка — лічыць, што гэта да няшчасця. Біць мяне яна не баіцца. Можа, гэта да шчасця». Словы, напісаныя дзіцячай рукой, не проста кранаюць сваёй шчырасцю, а вымушаюць задумацца. Напрыклад, пра тое, да чаго могуць прывесці такія паводзіны дарослых? Як варыянт, дзіця пачне аддаляцца ад бацькоў. Пачне шукаць той асяродак, дзе яго падтрымаюць і прымуць. Магчыма гэта будзе асацыяльная кампанія. Тут лёгка стаць сваім, нават «героем». Толькі вось аднойчы за геройства прыходзіцца плаціць.**

— Свае ўчынкі дзеці не ацэньваюць і не ўсведамляюць. Вось хлопчык здзейсніў 26 крадзяжоў веласіпедаў. Разважаў так: вазьму, пакатаюся і пастаўлю на месца. Аб тым, што браў чужое, нават і не задумваўся, — дзеліцца часова выконваючы абавязкі начальніка прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх УУС Мінаблвыканкама маёр міліцыі Ларыса Лычкоўская. — Дагэтуль імкнуся зразумець, адкуль у дзецях гэта пачуццё ўсёдазволенасці і беспакаранасці. Бацькі самі заахвочваюць такія паводзіны. Дзіця — гэта ж губка, якая ўбірае сітуацыі і рэакцыі. Калі ж пачынаюць шукаць прычыны, то вінавацяць звычайна школу, сяброўскую кампанію. А ўсё ж пачынаецца з бацькоўскага выхавання.

Некаторыя з дзяцей, якія аступіліся ў жыцці, часова знаходзяць свой прытулак у сценах прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх. Сярод малых, якія трапляюць сюды, тыя, хто рашэннем суда накіраваны ў навучальныя ўстановы закрытага тыпу. Часцей за ўсё яны асуджаны за крадзяжы, радзей сюды трапляюць дзеці, якія ўчынілі забойствы ці спробу забойства. Тэрмін іх знаходжання ў гэтай установе не перавышае 30 дзён. За гэты час тут павінны «сабраць» дзіця для накіравання ў вучэбна-выхаваўчыя ўстановы закрытага тыпу, якія знаходзяцца ў Магілёве (для хлопчыкаў) і ў Петрыкаве (для дзяўчынак), а таксама ў лячэбна-выхаваўчую ўстанову закрытага тыпу, што ў гарадскім пасёлку Крывічы Мядзельскага раёна.

— Інспектар па прафілактыцы прымае дзіця і вядзе яго да моманту накіравання ў спецустанову. У першы дзень праводзіцца азнаямленчая гутарка, — тлумачыць Ларыса Барысаўна. — Здараецца, што дзіця знаходзіцца ў стане шоку, трапіўшы да нас. Тады мы імкнёмся перачакаць і толькі потым размаўляем па справе. Псіхолаг і выхавацелі таксама праводзяць гутаркі з імі. Лягчэй атрымліваецца наладзіць кантакт з дзецьмі, калі яны знаходзяцца ў групе.

А вось хлопчыкі і дзяўчынкі, якіх прывозяць пасля самавольнага зыходу з дому, затрымліваюцца ненадоўга. Бацькоў просяць забіраць дачку ці сына ў максімальна кароткія тэрміны, бо ніколі не ведаеш, што можа адно аднаму на вушка сказаць дзіця і чаму навучыць. «Таленты» тут выяўляюцца часам самыя розныя: могуць і падмануць, і зымітаваць хваробу, і абразіць старэйшага. Таму практыкуюцца кругласутачны нагляд, відэаназіранне і дысцыпліна. А самае горкае пакаранне, калі за неналежныя паводзіны пазбаўляюць магчымасці спаткання з бацькамі.

Сустрэць тут можна і маленькіх грамадзян з замежжа. Тэрмін іх знаходжання ў гэтай установе — 60-75 сутак. Прычына — доўгі працэс афармлення дзіцяці, каб можна было вывезці яго з нашай краіны. Часта для замежных грамадзян даводзіцца рабіць экспертызу ўзросту, бо звесткі, якія дзеці паведамляюць, не адпавядаюць рэчаіснасці.

Прыёмнік-размеркавальнік прымае дзяцей ад 3 да 18 гадоў. Распарадак дня тут нагадвае летні лагер, дзе з «кантынгентам» займаюцца па школьнай праграме, вучаць падтрымліваць парадак. Толькі вось змена не для кожнага заканчваецца ад'ездам дадому.

— У нас закрытая ўстанова. Для дзяцей стараемся абсталяваць усё як дома. Каб дапамагчы адаптавацца ў нашых умовах, вырашыць нейкія праблемы псіхаэмацыянальнага характару ў максімальна кароткія тэрміны, — расказвае псіхолаг прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх УУС Мінаблвыканкама Наталля Фалевіч. — Як правіла, дзіця трапляе ў нашу ўстанову па адной і той жа схеме: канфлікты ў школе, непаразуменне ў сям'і і непедагагічныя сродкі ўздзеяння на дзяцей. Ім не хапае эмацыянальнай цеплыні, любові, права выбару і прыняцця рашэнняў. Што ў выніку прымушае маленькага чалавека прымкнуць да асяроддзя, якое прыме яго і будзе ўспрымаць як свайго.

Прыёмнік-размеркавальнік лічыцца ўстановай прафілактычнай, бо дзецям, якія сюды трапляюць, важна паказаць, што жыццё бывае рознае. Сюды прыязджаюць з канцэртамі вучні з мінскіх школ, тут праводзяцца розныя акцыі з запрашэннем вядомых людзей. Працуюць тут і над духоўным і маральным выхаваннем асобы. Вядуцца размовы, абмяркоўваюцца фільмы. Так дзецям наглядна паказваюць: жыццё мае безліч варыянтаў і ў ім хопіць месца для ўсіх.

Кожны новы дзень тут — крок да будучыні. Адны вернуцца дадому, каб застацца там ці, магчыма, збегчы зноў, другія з'едуць на навучанне ў школы закрытага тыпу, трэція вернуцца ў сваю краіну. Але час, які кожны з іх правёў у сценах прыёмніка, бясследна не пройдзе...

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 08 2012 г.

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 29 августа 2012 г. 127-го ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ, НАХОДЯЩИХСЯ В КОММУНАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ г. Минска

| № предмета аукциона | Наименование объекта недвижимости, его адрес, описание, условия аукциона | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная (стартовая) цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02** | | |
| 1. | Ул. Голодеда, 18, корп. 1, помещение на первом этаже жилого дома (колясочная), имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, общий вход с жильцами, требуется ремонт. Под административное использование – офис. | 25,51 | 2 560 |
| 2. | Ул. Герасименко, 20, пом. 39а, помещение на первом этаже жилого дома (колясочная), имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, общий вход с жильцами. Под административное использование – офис. | 33,22 | 3 330 |
